

Легенды пасляваеннага Мінска

СТАР. 5



Карэкціруем сямейную «харчовую палітыку»

СТАР. 6



Мода з нацыянальным каларытам

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 МАЯ 2016 г. СЕРАДА № 83 (28193) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Пяты Усебеларускі народны сход пройдзе ў Мінску 22-23 чэрвеня

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 3 мая падпісаў Указ № 164 «Аб скліканні пятага Усебеларускага народнага сходу». Рашэнне аб скліканні 22-23 чэрвеня ў Мінску пятага Усебеларускага народнага сходу Прэзідэнт прыняў у мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. На абмеркаванне выносяцца пытанні аб выніках рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады і аб асноўных палажэннях Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады.

Указам устаноўлена колькасць удзельнікаў сходу, якая складае 2,5 тысячы чалавек, а таксама вызначаны найважнейшыя арганізацыйныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенні сходу.

## ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ — ЭЛІТНАЯ

**Прэзідэнт запатрабаваў не спрашчаць працэдуру паступлення, каб забяспечыць якасны адбор студэнтаў**

Уступныя іспыты ў Беларусі неабходна асучасніць. На гэтым зрабіў акцэнт Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 3 мая ў час нарады па пытаннях карэкціроўкі правіл прыёму ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. На думку Аляксандра Лукашэнкі, існуючая ў краіне ў выглядзе ЦТ сістэма прыёму ў ВНУ і ССНУ не павінна быць застылай, неабходна, каб яна гнутка рэагавала на сучасныя павевы. Прэзідэнт адзначыў, што існуюць розныя пункты гледжання наконт цэнтралізаванага тэсціравання, але няма і значнай перавагі ні ў адзін, ні ў другі бок. Кіраўнік дзяржавы ў сваю чаргу больш арыентуецца ў гэтым пытанні на экспертаў і грамадства.

На нарадзе таксама абмяркоўваліся меры для павелічэння набору абітурыентаў на востра запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. У сувязі з гэтым Прэзідэнт запатрабаваў не спрашчаць працэдуру паступлення, каб забяспечыць якасны адбор студэнтаў. Кіраўнік дзяржавы выказаўся за тое, каб пры прыёме на такія спецыяльнасці абітурыенты праходзілі гутарку, якая давала б магчымасць ацаніць, наколькі ўзровень іх ведаў адпавядае выбранай спецыяльнасці. Вышэйшая адукацыя, упэўнены Аляксандр Лукашэнка, не павінна быць масавай у адмоўным сэнсе гэтага слова, неабходна, каб яна заставалася элітарнай.

Пры падрыхтоўцы спецыялістаў у ВНУ трэба арыентавацца на патрэбнасці эканомікі, прадоўжыў Прэзідэнт. «Мы будзем заўсёды зыходзіць з гэтай патрэбнасці па колькасным і якасным складзе нашых абітурыентаў, будучых студэнтаў», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Абітурыенцкай кампаніі ў Беларусі традыцыйна ўдзяляецца пільная ўвага. Сёлета яна таксама павінна прайсці зладжана, запатрабаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка па выніках нарады ў цэлым ухваліў прапанаваныя змены і дапаўненні ў правілы прыёму ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Чакаецца, што навацыі ўступяць у сілу з 2017 года. Абітурыенты атрымаюць, у прыватнасці, магчымасць здаваць ЦТ па чатырох прадметах пры паступленні ў ВНУ і па трох — у ССНУ. Перыяд дзеяння сертыфіката ЦТ павялічыцца да двух гадоў, а колькасць рэзервовых дзён цэнтралізаванага тэсціравання — да трох дзён.

У час нарады закранаmenоs іншыя аспекты дзейнасці сістэмы адукацыі ў цэлым. Адзначалася, што яна павінна развівацца на аснове найлепшага вопыту з улікам сучасных тэндэнцый.

## ПЫТАННІ ЮРЫСДЫКЦЫІ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Вярхоўнага Суда Валянціна Сукалу.**

На сустрэчы абмеркаваны шэраг пытанняў функцыянавання аб'яднанай судовай сістэмы. У прыватнасці, размова ішла аб змяненні дыслакацыі штатнай колькасці суддзяў за кошт унутраных рэзерваў судовай сістэмы. Было даложана, што цяпер нагрузка ў эканамічных судах значна ўзрасла і стала вышэйшай, чым у судах агульнай юрысдыкцыі. У сувязі з гэтым прапанавана частку суддзяў агульнай юрысдыкцыі перавесці ў эканамічныя суды. Паколькі гэтае пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі Прэзідэнта, то ён даручыў падрыхтаваць адпаведны нарматыўны акт па змяненні дыслакацыі штатнай колькасці суддзяў.

Акрамя таго, разглядалася пытанне ўзвядзення новага будынка Вярхоўнага Суда, яго фінансавання і падрыхтоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі з пункту гледжання мінімізацыі расходаў на праект і ўзвядзенне будынка.

На сустрэчы таксама абмяркоўвалася тэма якасці папярэдняга расследавання па некаторых канкрэтных крымінальных справах, што знаходзяцца на кантролі Прэзідэнта

# З ПАВАГАЙ І ПАМЯЦЦЮ



Жыхарка Віцебска Ксенія ПЕРАВЕРЗЕВА на фронце была старшым механікам 877-га знішчальнага палка 1-га Беларускага фронту. Ветэрану ёсць што ўспомніць пра сваю баявую маладосць. Удзячныя зацікаўленыя слухачы знаходзяцца заўсёды, а цяпер іх можа стаць яшчэ больш: на доме ўдзельніцы Вялікай Айчыннай актывісты БРСМ Першамайскага раёна Віцебска прымацавалі таблічку «Тут жыве ветэран».

Фота БЕЛТА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

***1 млн 963,2 тыс.***

*чалавек склала колькасць насельніцтва Мінска на 1 красавіка — за І квартал года яна павялічылася на 3,4 тыс. чалавек. У студзені–сакавіку ў сталіцы нарадзілася 5 385 дзяцей, што на 149 дзяцей больш у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Колькасць памерлых знізілася ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года на 24 чалавекі (на 0,5%). У студзені–сакавіку ў Мінску захаваўся натуральны прырост, які склаў 890 чалавек, гэта на 173 чалавекі (на 19,4%) больш, чым у студзені–сакавіку 2015 года. У студзені–сакавіку зарэгістравана 2 735 шлюбных саюзаў, афіцыйна скасавалі шлюб 1 925 сем'яў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19121,00 | ▼ |
| Еўра | 22116,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 294,85 | ▼ |
| Укр. грыўня | 763,94 | ▼ |

■ Прамая лінія

## АДЗІНЫ СТАТУС НЕРУХОМАСЦІ

**На пачатку дачнага сезона і палявых работ «Звязда» традыцыйна запрасіла да сябе старшыню Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэя Гаева на «прамую лінію» з кіраўніком ведамства, якое адказвае за зямельныя і маёмасныя пытанні ў нашай краіне. Дазванілася каля двух дзясяткаў чытачоў. Прапануем вашай увазе самыя актуальныя тэмы гэтай размовы.**

### Афармляць лепш своечасова

**Таццяна Георгіеўна,** *Мінская вобласць:*

***— У свой час мой муж працаваў кіраўніком племяннай гаспадаркі сельгаспрадпрыемства і атрымаў ад яго 15 сотак. Гэта было ў 90-я гады. Аднак той арганізацыі, якая давала нам участак, сёння ўжо няма, бо адбылася рэарганізацыя. У нас на зямлю засталіся дакументы тых часоў. Зараз мы вырашылі гэты ўчастак прыватызаваць. З чаго пачынаць?***

— А што ўяўляе сабой гэты ўчастак? Для чаго яго вам давалі? І, па-другое, чаму гэты ўчастак да гэтага часу не быў афармлены? Ці ёсць там нейкія пабудовы?

***— Участак знаходзіцца каля горада Баранавічы. Даваўся ён для садаводства або пад бульбу.***

— Так, быў пэўны час, калі для садаводства людзям давалі ўчасткі нават у межах населеных пунктаў. Але тады на сям'ю вылучалі не больш за 10 сотак. Якую назву мае ваша таварыства?

СТАР. 2




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Прадпрымальніку на заметку

## ВІРТУАЛЬНАЕ ПАЦВЯРДЖЭННЕ ЯКАСЦІ

### Тавары легпрама: як зарэгістраваць дэкларацыю анлайн?

**Зарэгістраваць дэкларацыю аб адпаведнасці прадукцыі патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (ТР МС) з нядаўняга часу юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі могуць анлайн. Цяпер у іх ёсць выбар — рэгістраваць гэты дакумент у органе па сертыфікацыі, як гэта было заўсёды, або выканаць гэтую працэдуру самастойна, скарыстаўшыся інфармацыйнай сістэмай «Паведамляльнае дэклараванне адпаведнасці».**

Рэгістрацыю дэкларацый аб адпаведнасці ў электроннай форме ажыццяўляе ўпаўнаважаны орган — Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС).

Пакуль новая сістэма дзейнічае толькі ў дачыненні да ТР МС на прадукцыю, прызначаную для дзяцей і падлеткаў, а таксама на прадукцыю лёгкай прамысловасці. Гэты пералік плануецца пашырыць.

Пра магчымасці новай сістэмы карэспандэнту газеты «Звязда» расказвае **начальнік сектара БелДІСС, адміністратар упаўнаважанага органа па рэгістрацыі дэкларацый аб адпаведнасці ў электроннай форме Вольга ЧЭРНІК.**

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Турцыя адмяніла візы для дзяржаў Шэнгенскай зоны



У Турцыі ўступіў у сілу закон аб адмене візавых абмежаванняў для краін Шэнгенскай зоны. Такім чынам Анкара папярэдне падрыхтавала неабходную заканадаўчую базу для ключавой з пункту гледжання стасункаў з Брусэлем і працэсаў еўраінтэграцыі падзеі. Сёння Еўракамісія павінна разгледзець выніковую справаздачу аб прагрэсе перамоў з Турцыяй у частцы візавай лібералізацыі. У выпадку яе ўхвалення фактычна павінен пачацца падрыхтоўчы працэс, па выніках якога да 30 чэрвеня шэнгенскія візы для грамадзян Турцыі будуць адменены. Анкары для гэтага неабходна выканаць 72 умовы. Паводле інфармацыі, якую распаўсюдзілі СМІ, ЕК схільная ўхваліць адмену віз з Турцыяй, калі краіна сапраўды ўсё выканала.

### Іспанскі кароль распусціў парламент



Кароль Іспаніі Філіп VI падпісаў указ аб роспуску парламента. Гэта адбылося пасля таго, як у ноч з 2 на 3 мая скончыўся тэрмін, адведзены манархам палітычным партыям краіны для фарміравання кіруючай кааліцыі. Новыя выбары прызначаны на 26 чэрвеня. Прычынай роспуску парламента стаў палітычны крызіс, у якім краіна апынулася пасля папярэдніх выбараў. Народная партыя Марыяна Рахоя, якая да таго кіравала краінай, хоць і заняла па выніках галасавання першае месца, але не змагла ў адзіночку сфарміраваць урад.

### Вуліцы Рыма і Мілана пачнуць патруляваць кітайскія паліцэйскія

Улады Італіі прыцягнуць кітайскіх паліцэйскіх для патрулявання вуліц у Рыме і Мілане. Пра гэта паведаміў міністр унутраных спраў краіны Анджэліна Альфана, перадае The Guardian. Паводле яго слоў, патрулі, якія складаюцца з суайчыннікаў, дапамогуць кітайскім турыстам адчуваць сябе ў бяспецы. Паліцэйскія, якія прайшлі навучанне пад кіраўніцтвам італьянскіх спецыялістаў у Пекіне, будуць насіць форму, прынятую ў Кітаі, каб грамадзяне КНР маглі іх пазнаваць. Патрулі будуць перадаваць інфармацыю італьянскім праваахоўнікам і дапамагаць суайчыннікам кантактаваць з мясцовымі ўладамі пры неабходнасці.

ISSN 1990 - 763X
16083>
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Трэніроўка вынослівасці падаўжае жыццё пажылых людзей

Даследчыкі прааналізавалі дадзеныя больш як 30 000 чалавек ва ўзросце, старэйшым за 65 гадоў. Больш як 9% пажылых людзей сама меней два разы на тыдзень займаліся сілавымі трэніроўкамі. Даследаванне паказала: удзельнікі, якія трэніраваліся, радзей паміралі на працягу наступных 10 гадоў, перадае Zee News. У такіх добраахвотнікаў была на 41% зніжана рызыка смерці ад хваробы сэрца, а верагоднасць смерці ад раку — на 19%. Па словах спецыялістаў, уплыў сілавых трэніровак на здароўе мала вывучаны. Тым не менш вядома, што яны станоўча ўплываюць на мышачную масу, функцыянальны стан і карысныя для людзей з хранічнымі захворваннямі, такімі як дыябет, астэапароз, астэахандроз і атлусценне.



Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях




## КАНІКУЛЫ БЕЗ ПРАБЛЕМ

**Два месяцы таму ў Мінску 9-гадовы школьнік сам справіўся з пажарам да прыезду ратавальнікаў. Хлопчык знаходзіўся дома адзін. Ён уключыў тэлевізар і пайшоў на кухню. А калі вярнуўся адтуль у пакой, то ўбачыў, што прыбор гарыць. Хлопчык тут жа адключыў тэлевізар ад электрычнасці, заліў полымя вадой і пакінуў кватэру. Пасля высветлілася, што пажар адбыўся з-за кароткага замыкання. Школьнік пасля расказаў, што літаральна за некалькі дзён наведаў урок па пажарнай бяспецы і скарыстаў атрыманыя на ім веды.**

Зусім хутка настане гарачая пара. Дзеці адкладуць убок падручнікі і сшыткі, якія надакучылі за доўгія дзевяць месяцаў, і адправяцца на доўгі адпачынак. Шмат часу яны будуць праводзіць дома, пакуль бацькі знаходзяцца на працы. Але як жа зрабіць так, каб лета не было азмрочана трагедыяй? І якія захады мусяць прыняць бацькі? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з прэс-сакратаром Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Крысцінай Зайцавай.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### ЗНАЙШЛІ МАЛЫЯ ПОРАХ...

— Рыхтаваць дзяцей да летняга адпачынку мы пачынаем ужо цяпер. У маі стартуе акцыя «Не пакідайце дзяцей адных!». Ратавальнікі прыйдуць у школы, дзіцячыя садкі, завітаюць да шматдзетных сем'яў і ў дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Непасрэдна з чэрвеня пачнецца яшчэ адна акцыя — «Канікулы без дыму і агню». Тут нашых спецыялістаў варта чакаць у аздараўленчых і прышкольных лагерах. Мы правядзём навучальныя гутаркі і звернем увагу на, здавалася б, звычайныя побытавыя моманты, якія могуць хаваць у сабе небяспеку.

СТАР. 3

КОРАТКА

**У Беларусі, паводле звестак на 1 красавіка гэтага года, пражываюць 13 тыс. 682 ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.**

На рэспубліканскім суботніку зароблена Br71 млрд 870 млн.

**Пералік вострa запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў (якія неабходны эканоміцы, але недастаткова папулярныя сярод абітурыентаў) плануюць фарміраваць кожны год. Ён будзе складацца з 2017 года і штогод удакладняцца з улікам вынікаў папярэдняй уступнай кампаніі.**

Аранжавы ўзровень небяспекі быў уведзены ўчора ў Беларусі з-за навальніц і ліўняў.

**Асаблівая ўвага ў законапраекце «Аб абыходжанні з жывёламі» будзе ўдзелена менавіта сабакам патэнцыяльна небяспечных парод, пералік якіх распрацуюць спецыяльна да выхаду дакумента.**

■ Ва ўрадзе

# РЭБУС ШКЛА І ЦЭМЕНТУ

**Падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ адзначыў, што істотнага прагрэсу ў вырашэнні праблем цэментнай і шкляной галін краіны пакуль няма. Такую выснову ён зрабіў па выніках працы гэтых сфер сёлета ў першым квартале.**

Прэм'ер-міністр нагадаў, што кіраўнік дзяржавы даваў шэраг даручэнняў па павышэнні эфектыўнасці работы і забеспячэнні ўстойлівага фінансавага становішча арганізацый цэментнай і шкляной прамысловасці. У канцы 2015 года быў прыняты шэраг указаў і распараджэнняў Прэзідэнта па пытаннях аказання дзяржаўнай падтрымкі адпаведным арганізацыям.

Паводле слоў Андрэя Кабякова, зараз урадам таксама прымаецца шэраг мер па фінансавым аздараўленні і павышэнні канкурэнтаздольнасці гэтых галін на ўнутраным і знешнім рынках. Аднак без выніковай работы саміх арганізацый па зніжэнні сабекошту прадукцыі, нарошчванні паставак на экспарт пры дасягненні адпаведнай якасці і павелічэнні асартыменту нельга дасягнуць пастаўленых мэт.

Ён таксама адзначыў, што па выніках разгляду на пасяджэнні калегіі КДК па пытаннях эфектыўнасці работы арганізацый цэментнай прамысловасці і выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па пытанні выкарыстання цэменту на дарожнае будаўніцтва, праца Мінбудархітэктуры, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама прызнана нездавальняючай. Пры гэтым па арганізацыі выканання гэтых даручэнняў адзначана недастатковая каардынацыя з боку Мінтранса. Прэм'ер-міністр растлумачыў, што аб'ёмы спажытага цэменту аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам на дарожную гаспадарку ў 2015 годзе склалі толькі 120 тыс. тон, што не дазволіла выканаць даручэнні Прэзідэнта па засваенні не менш як 10% цэменту ад агульнага аб'ёму, выробленага ў краіне. Самы нізкі працэнт спажывання цэменту на дарожную гаспадарку ў Віцебскага, Мінскага, Магілёўскага аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# ВІРТУАЛЬНАЕ ПАЦВЯРДЖЭННЕ ЯКАСЦІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Перш за ўсё давайце нагадаем, што ўяўляе сабой дэкларававанне адпаведнасці прадукцыі?***

— Дэкларававанне адпаведнасці — гэта адна з формаў пацверджання адпаведнасці прадукцыі патрабаванням, устаноўленым у ТР МС (ЕАЭС). Асаблівасць яе складаецца ў тым, што вытворца самастойна вызначае, ці распаўсюджваецца тэхрэгламент на яго тавар. Ён таксама адбірае ўзоры прадукцыі, аддае іх на выпрабаванні, фарміруе камплект доказных матэрыялаў, на падставе якіх прымае рашэнне аб прыняцці дэкларацыі і, такім чынам, нясе ўсю паўнату адказнасці за бяспеку тавару пры размяшчэнні на рынку. Такая форма ацэнкі адпаведнасці з'яўляецца пераважнай ва ўсіх ТР МС, што ўзгадняецца з міжнароднай і еўрапейскай практыкай. Дэкларацыя аб адпаведнасці падлягае абавязковай рэгістрацыі, і інфармацыя пра яе ўносіцца ў Адзіны рэестр выдадзеных сертыфікатаў адпаведнасці і зарэгістраваных дэкларацый аб адпаведнасці.

***— Якія перавагі рэгістрацыі дэкларацыі аб адпаведнасці ў электроннай форме можна вылучыць?***

— Увядзенне такой паслугі, безумоўна, дазваляе эканоміць і час заяўніка (за кошт электроннага ўзаемадзеяння паміж ім і ўпаўнаважаным органам, якое рэалізуецца непасрэдна з працоўнага месца заяўніка), і фінансавыя выдаткі.

Камплект дакументаў, якія падаюцца для рэгістрацыі дэкларацыі аб адпаведнасці ў электроннай форме ва ўпаўнаважаны орган, таксама значна скарочаны. У прыватнасці, не патрабуецца прадастаўляць узоры маркіроўкі, пратаколы выпрабаванняў і дакументы, якія пацвярджаюць правядзенне вытворчага кантролю. Дастаткова толькі заявы, самой дэкларацыі аб адпаведнасці, пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы або індывідуальнага прадпрымальніка і пры неабходнасці — дагавора на ўпаўнаважванне. Прычым пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі прадстаўляецца заяўнікам адзін раз пры яго рэгістрацыі ў інфармацыйнай сістэме і ў далейшым пры рэгістрацыі дэкларацый аб адпаведнасці не патрабуецца.

Пры гэтым трэба дакладна разумець, што за дакладнасць і паўнату ўсёй названай у дэкларацыі аб адпаведнасці інфармацыі адказнасць нясе заяўнік, а не ўпаўнаважаны орган.

***— Які кошт такой працэдуры?***

— Гэта 290 тысяч беларускіх рублёў, прычым незалежна ад таго, рэгіструецца дэкларацыя аб адпаведнасці на прадукцыю, якая выпускаецца серыйна, альбо на партыю. Гэта значна ніжэй за кошт у органе па сертыфікацыі, дзе цана рэгістрацыі дэкларацыі аб адпаведнасці на партыю прадукцыі складае ад 600-700 тысяч беларускіх рублёў, а для серыйнай прадукцыі памер платы ўзрастае амаль у два разы.

***— Давайце больш падрабязна спынімся на алгарытме правядзення рэгістрацыі дэкларацый аб адпаведнасці ў электронным фармаце.***

— Для пачатку патэнцыйны заяўнік заходзіць у сістэму «Паведамляльнае дэкларававанне адпаведнасці» па адрасе https://tsouz.belgiss.by і загружае яе на свой камп'ютар. Потым заяўнік рэгіструецца ў гэтай сістэме ў якасці карыстальніка. Звярну ўвагу, што, перад тым як пачынаць запаўненне формы дэкларацыі аб адпаведнасці, карыстальнік павінен атрымаць электронны лічбавы подпіс у Рэспубліканскім засведчвальным цэнтры.

Затым ён далучае праекты дэкларацыі аб адпаведнасці і заявы, падпісвае іх электронным лічбавым подпісам. Пры гэтым інфармацыйная сістэма сама запаўняе шаблоны дакументаў, дзе ўжо ўнесена ўся інфармацыя аб заяўніку, якая змешчана пры яго рэгістрацыі ў сістэме ў якасці карыстальніка.

Далей заяўніку неабходна аплаціць паслугу па рэгістрацыі дэкларацыі аб адпаведнасці. БелДІСС разглядае пададзеныя дакументы на працягу не больш як трох дзён пасля аплаты. У залежнасці ад вынікаў заяўнік атрымлівае апавяшчэнне — ці аб адмове (напрыклад, не ўсе палі дэкларацыі былі запоўнены), ці аб прысваенні дэкларацыі рэгістрацыйнага нумара.

Пры атрыманні станоўчага выніку заяўнік уносіць усю неабходную інфармацыю ў дэкларацыю аб адпаведнасці, і з гэтага моманту можа ўжо яе выкарыстоўваць.

Інфармацыя пра зарэгістраваную дэкларацыю аб адпаведнасці размяшчаецца ў агульным доступе ў Адзіным рэестры выдадзеных сертыфікатаў адпаведнасці і зарэгістраваных дэкларацый аб адпаведнасці ў першы працоўны дзень, наступны за днём размяшчэння ў інфармацыйнай сістэме апавяшчэння аб прысваенні рэгістрацыйнага нумара.

***— Хто-небудзь ужо скарыстаўся новым фарматам рэгістрацыі дэкларацыі?***

— Так, першым гэта зрабіла Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне. Яно прыняло дэкларацыю аб адпаведнасці на тканіны, якія выпускаюцца серыйна, на адпаведнасць патрабаванням ТР МС 017/2011 «Аб бяспецы прадукцыі лёгкай прамысловасці».

Сёння ўжо зарэгістравана 15 дэкларацый аб адпаведнасці, з іх 12 — індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Для тых, хто вырашыў скарыстацца інфармацыйнай сістэмай, БелДІСС на сістэмнай аснове праводзіць бясплатныя семінары, дзе тлумачыцца алгарытм працы ў ёй.

Цікавасць да гэтай працэдуры ўзрастае, і я думаю, што новы спосаб хутка зойме вядучыя пазіцыі ў работах па дэкларававанні адпаведнасці прадукцыі патрабаванням ТР МС.

**Дар'я ШОЦІК.**

Марат ЖЫЛІНСКІ:

# «ЖАДАННЕ БЫЦЬ РАЗАМ — У ПАДСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ»

V Усебеларускі народны сход

**Беларусы спрадвеку прымалі важныя рашэнні супольна. Гэта воляй-няволяй адбілася на нашай свядомасці і нават на генах, якія часта вызначаюць, што мы робім, як жывём і робім выбар. Думкамі пра тое, як мянялася разуменне калектыўнага нашым народам і якія формы яно набывала, падзяліўся Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

***— Марат Генадзьевіч, шмат гаворыцца пра тое, што Усебеларускі сход — новая форма, у якой увасоблена традыцыя прымаць рашэнні разам, супольна. Ці сапраўды яна ніколі не перарывалася?***

— Адразу хачу сказаць, што мы, беларусы, нацыя калектыўнага кірунку, мы не індывідуалісты. Гэта звязана з нашай гісторыяй яшчэ са старажытных часоў. Я маю на ўвазе веча, якія адбываліся ў Кіеўскай, Наўгародскай, а таксама ў Полацкай Русі. Гэта сход дарослых мужчын горада, на якім вырашаліся пытанні вайны і міру, заключэння ваенных і гандлёвых дагавораў, саюзаў, у тым ліку шлюбных. Іншымі словамі — гэта форма калектыўнага прыняцця рашэнняў. У той час гэта быў акт дэмакратыі, у якім князь у мірны час меў права на слова на роўных з іншымі ўдзельнікамі веча. Падчас вайны ўлада цалкам пераходзіла ў рукі князя і яго дружыны.

У Вялікім Княстве Літоўскім былі сеймы, соймікі, рознага кшталту заканадаўчыя формы ўлады. Праўда, калі ўсходнеславянская традыцыя пайшла па шляху цэнтралізаванай улады ў асобе манарха, князя, цара, то на тэрыторыі ВКЛ, больш блізкай да Еўропы, наадварот, назіралася дэцэнтралізацыя ўлады. Падчас існавання Рэчы Паспалітай у яе сістэме існавала права «ліберум вета», якое дазваляла любому члену заканадаўчага органа не даваць згоду на пэўнае рашэнне. Трыста чалавек згодны, адзін не — і рашэнне не прынята. Гэта выключная форма дэмакратыі, якая паказала сябе неэфектыўнай і, на думку гісторыкаў, менавіта ў тым ліку і з-за яе Рэч Паспалітая развалілася.

***— А што адбывалася ў часы, калі нашы землі належалі Расійскай імперыі?***

— На жаль, беларускія землі знаходзяцца на разломе цывілізацый. На такім разломе знаходзіцца і Украіна. Прыбалтыйскія краіны больш набліжаны да еўрапейскай часткі. Гэта відаць і па тых палітычных рэаліях, якія пануюць сёння.

Калі беларускія землі сталі часткай Расійскай імперыі — Паўночна-Заходнім краем, нават у тых умовах беларусы ўжо маглі развівацца не толькі як народнасць, але і як народ. Таму гэты перыяд, я лічу, сыграў на руку фарміраванню беларускай нацыі. Паўночна-Заходні край ужо на пачатку мінулага стагоддзя пачаў фарміравацца як самабытная, спрадвечная тэрыторыя беларусаў.

Пасля былі спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах нямецкай акупацыі — так з'явілася Беларуская Народная Рэспубліка. Гэта этап у развіцці фарміравання дзяржаўнасці, але трэба прызнаць, што спроба стварэння рэспублікі была няўдалай. Ды і ўвогуле, пра якую дзяржаўнасць можна казаць ва ўмовах акупацыі? Затым панавала савецкая дзяржаўнасць. Яна трансфармавала калектыўную свядомасць беларусаў і ўвасобілася ў выглядзе Вярхоўных Саветаў БССР, прадстаўнікоў выканаўчай улады ў Саветах народных камісараў. У той час Беларусь перажыла вялікія ваенныя выпрабаванні ўласнай дзяржаўнасці. Але вопыт існавання пры савецкай уладзе даў нам, беларусам, магчымасць развіць новыя формы калектывізму, заснаваныя на ўласцівых для нашага народа традыцыях.



Фота Надзеі БУЖАН.

***— А што тычыцца планаў на пяць гадоў, якія складаліся ў савецкі час?***

— Яны мелі на ўвазе не проста пастаноўку задач, але парыванне масы людзей, народа, калектыву, дзяржавы ў дасягненні таго, дзеля чаго мы жывём. Я, напрыклад, жыву дзеля сваіх дзяцей. Не хачу, каб яны з'ехалі ў Еўропу ці Злучаныя Штаты Амерыкі. Хачу, каб яны жылі на зямлі сваіх продкаў і працавалі тут. Таму і працую тут, у Беларусі, каб маім дзецям, а потым і ўнукам, жылося лепей.

***— І ўсё ж такі, на вашу думку, калі традыцыя калектывізму перапынялася?***

— У 1990-я гады. Тады праблема заключалася ў тым, што нас разарвалі, раз'ядналі. 70 гадоў жылі ў адзінай краіне, пакутвалі разам падчас Вялікай Айчыннай вайны, пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а пасля аказаліся адзін аднаму непатрэбныя. Той час змяніў не нашу падсвядомасць, а генную структуру калектывізму: навучыў жорсткаму індывідуалізму, прагматычнай навуцы выжывання. Гэта здарылася не толькі з намі, але і з усімі жыхарамі былога СССР.

З'явіўся пробліск надзеі, калі пасля атрымання незалежнасці, нягледзячы на ўсе глабальныя змены не толькі ў краіне, але і ў свядомасці беларусаў, мы ўзяліся наш агульны «дом» латаць, дабудоўваць, аднаўляць. Па факце — ствараць новы. І самае галоўнае, што ў гэтым доме мы не ведаем, што такое кроў і вайна. Так, у нас не самыя высокія зарплаты; у сістэме кіравання, як і ў любой іншай сістэме, ёсць непаладкі, але мы жывём у нашым агульным доме ў міры і спакоі.

Самае галоўнае ў нашай краіне — гэта чалавек. Але часам мы надта бесклапотныя, мы не бачым, як на зямлі нашых суседзяў гарыць агонь і разрываюцца бомбы. У савецкі час быў лозунг: «Людзі, будзьце пільнымі!» А я дадаў бы, што і адзінымі. Бо паасобку нас разарвуць. Мэта Усебеларускага сходу не столькі ў абмеркаванні сацыяльна-эканамічных паказчыкаў, колькі ў пасыле ўлады да народа, што мы павінны быць разам. Інакш праз стагоддзе нас будуць вывучаць па летапісах як памерлы народ. Ідэі еднасці прытрымліваюцца і тыя, хто не згодны з палітыкай дзейнай улады.

***— Ёсць погляд, што Усебеларускі сход — форма застылая, не адпаведная часу.***

— Не ва ўсіх краінах свету ўлада ініцыюе размову з прадстаўнікамі народа. У нас ёсць Пасланне Прэзідэнта, звернутае да народа і заканадаўчай улады. Але ўлада ўсё ж такі бярэ на сябе абавязацельства размовы з прадстаўнікамі народа, каб сказаць адкрыта: што дасягнута, а што не, чаму так адбылося. І каб людзі дакладна разумелі, куды далей рухаецца краіна, а пасля перадалі гэта сваім калектывам. Улада бярэ на сябе абавязак казаць не толькі пра добрае, але і пра тое, што не атрымалася, і тлумачыць, чаму так выйшла, дае справаздачу аб зробленым. Усебеларускі сход — гэта акт еднасці ўлады і народа, усіх нас — грамадзян нашай роднай Беларусі!

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ВЫСЛУХАЦЬ, СУПАКОІЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

**У краіне працягваюцца прамыя тэлефонныя лініі**

Задаць свае пытанні можна кожную суботу з 9 раніцы да паўдня. Па традыцыі, на званкі адказваюць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі спраў.

Такую форму працы са зваротамі грамадзян сталі практыкаваць у пачатку 2015 года. За гэты час тэлефонны званок стаў сапраўдным гарантам вырашэння амаль любой праблемы.

**У гэтую суботу, 7 мая, на пытанні адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васілевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПІРШТУК Баляслаў Казіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

# АДЗІНЫ СТАТУС НЕРУХОМАСЦІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Гэтыя соткі давалі нам тады на ўскрайку вёскі. Аднак участак не ўваходзіць у склад садаводчага таварыства. Ён асобна стаіць.***

— Калі зямля знаходзіцца ў межах вёскі, то вам трэба звяртацца ў мясцовы сельскі выканаўчы камітэт з заявай аб прадастаўленні гэтага ўчастка. Але папярэдне вам лепш удакладніць у спецыялістаў землеўпарадкавальнай службы рэгіёна пытанне аб тым, для якіх мэтаў ён быў прадугледжаны дакументацыяй. За ўчастак падаткі плацілі ўсе гэтыя гады?

***— Іх мы плоцім і цяпер. Справа ў тым, што сёлета гэта зямля трапіла ў межы горада. Нам здаецца, што потым яна пачне даражэць. Вось мы і вырашылі прыватызаваць участак.***

— У гэтым выпадку вам трэба звярнуцца ў землеўпарадкавальную службу горада Баранавічы. Там трэба ўдакладніць усю гісторыю ўчастка, а потым падаць адпаведную заяву. Калі ўчастак быў тады дадзены вам для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, то цяпер у горадзе зямля на гэтыя мэты не выдзяляецца. Але ёсць нюансы, бо пры пэўных абставінах участак (або частку яго) могуць пераафарміць для агародніцтва. Гэта пытанне патрабуе ўдакладнення. Вам лепш звярнуцца па тлумачэнні да спецыялістаў непасрэдна на месцы. Цяпер вы разумееце, што зямлю трэба было афармляць своечасова.

> **Калі ўчастак знаходзіцца ў прыватнай уласнасці і быў дадзены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, то дзяліць яго можна толькі ў выпадку дзялення і самога дома. Пусты ўчастак такой зямлі прадаваць ці дарыць наша заканадаўства не дазваляе.**

**Уладзімір Сідар,** *Мастоўскі раён:*

***— У 2008 годзе я купіў дом. Участак агароджаны. Але ўнутры гэтай агароджы ёсць яшчэ адзін, 0,154 га, узяты ў арэнду. У свой час былы гаспадар заключыў дагавор па гэтым кавалку зямлі. Цяпер я жадаю пераразаключыць гэты дагавор, але спачатку трэба скасаваць старую дамову з былым гаспадаром. Заяву гэты чалавек напісаў, але адмаўляецца плаціць за афармленне. Як мне прымусіць яго гэта зрабіць, ці хай усё застаецца як ёсць?***

— Так, сённяшні землекарыстальнік гэтай зямлі павінен звярнуцца ў агенцтва па рэгістрацыі (былое БРТІ) і за свой кошт зарэгістраваць спыненне права на ўчастак. Пасля гэтага вам неабходна звярнуцца ў выканкам з заявай на афармленне такога надзелу ўжо на сваё імя. Калі ўчастак уласнікам не выкарыстоўваецца працяглы час, то ён можа быць адабраны мясцовымі ўладамі і толькі потым, магчыма, перададзены вам.

***— Зямлёй гэтай карыстаюся я.***

— Юрыдычна гаспадаром праблемнай зямлі з'яўляецца афіцыйна зарэгістраваны арандатар. І калі ён не выкарыстоўвае яе, то і павінен спыніць права на валоданне ёй. А вось калі вы будзеце працягваць карыстацца неаформленым на сваё імя зямельным участкам, то гэта ўжо трактуецца нашым заканадаўствам як самавольнае заняцце зямлі, што прадугледжвае адміністрацыйную адказнасць датычна вас.

***— Участак агароджаны і выкарыстоўваецца па прызначэнні — для агародніцтва...***

— За выкарыстанне зямлі, на якую ў вас няма дакументаў, вас могуць аштрафаваць за парушэнне зямельнага заканадаўства. Калі карыстальнік участка не хоча нічога рабіць па гэтым пытанні, то параю вам звярнуцца ў выканкам з адпаведнай скаргай. У любым выпадку пытанне з афармленнем такой зямлі трэба вырашаць абавязкова. А ўвогуле, усе спрэчныя моманты наконт рэгістрацыі зямельных участкаў вам неабходна было вырашаць яшчэ ў 2008 годзе, менавіта ў той час, калі афармлялася здзелка па куплі-продажы нерухомай маёмасці.

## Капітальны басейн і лазня ў дадатак

**Ірына Кульша,** *Мінская вобласць:*

***— У нас ёсць хатка ў вёсцы ў сталічным рэгіёне (менш за 100 км ад МКАД), дзе жывуць бацькі амаль увесь год. Побач з намі купіў домік расіянін. Жыве ён там толькі некалькі месяцаў і выключна летам. Гэты сусед арганізаваў там такі штучны вадаёмчык. Папярэдне ён вырыў невялікую яму, паставіў туды ёмістасць і... атрымаўся для дзетак сезонны басейн. Усё цудоўна, але стаіць гэты басейн упрытык да нашага ўчастка, дзе ў нас клубніцы і зяляніна розная. Малыя там гуляюць актыўна, таму вада адтуль цэлымі ручайкамі на наш участак і льецца. Такая бывае паводка мясцовага маштабу. Мы з ім размаўлялі, але...***

***Ці магчыма афіцыйна прымусіць суседа перанесці гэты водны аб'ект крыху далей ад мяжы з нашым участкам?***

— Магчыма. Выкарыстанне ўласнага ўчастка павінна ажыццяўляцца такім чынам, каб падчас гэтых дзеянняў не парушаліся правы іншых землекарыстальнікаў. Таму, калі сусед парушае вашы правы, то спачатку паспрабуйце знайсці з ім кампраміс. Другім вашым крокам будзе наведванне землеўпарадкавальнай службы, дзе і варта ўзняць гэтае пытанне. У гэтай сітуацыі будзе мець значэнне характар воднага аб'екта: наколькі ён капітальны ды трывалы і ці трэба было пры яго ўзвядзенні атрымліваць адпаведны дазвол на яго будаўніцтва і размяшчэнне. Калі гэты аб'ект мае капітальны характар, то існуюць яшчэ і архітэктурныя нормы, па якіх для гаспадарчых пабудоў трэба адступаць не менш за метр ад мяжы з суседнім участкам.



***— А другія суседзі пабудавалі невялікую лазню на ўчастку. І гэта добра, толькі вось мыльная вада ад іх праз трубу наўпрост трапляе ў грамадскую сажалку, дзе плаваюць розныя качкі і іншыя вадаплаўныя птушкі. Яны ж загінуць могуць ад гэтай хіміі.***

— У гэтым выпадку вам трэба звяртацца да эколагаў і патрабаваць пакараць парушальнікаў, а таксама спыніць паступленне бруднай вады ў сажалку.

## Лепш без хітрыкаў

**Алена Бяганская,** *горад Мінск:*

***— Сёлета з першых дзён ліпеня непрыватызаваныя кватэры стануць камерцыйным жыллём, і потым такое жыллё будзе толькі дзяржаўным?***

— Так, прыватным яно потым ужо не стане.

***— Тады ў мяне пытанне. Калі я паспрабую прапісацца да сваёй старэнькай цёткі і дапамагчы ёй прыватызаваць кватэру, то ці змагу потым гэтае жыллё атрымаць ва ўласнасць?***

— Калі ў прыватызацыі будзе ўдзельнічаць толькі ваша цётка, то менавіта яна потым і будзе ўласнікам гэтай маёмасці. Пытанне ў тым, ці зможаце вы як сваяк удзельнічаць у прыватызацыі кватэры з наступным вызначэннем доляў такога жылля. Гэта вам трэба ўдакладніць у аддзеле жыллёвай палітыкі мясцовага гарвыканкама.

***— А калі толькі прапісацца і дапамагчы ёй у прыватызацыі палюбоўна без афармлення, то яна зможа гэтую кватэру потым мне пакінуць?***

— Так, у якасці ўласніка яна будзе мець права перадаць вам сваю кватэру па спадчыне або падараваць. Тут я адразу ўдакладню, што цётка будзе мець права, а не абавязак пераафарміць сваю кватэру на ваша імя. Не ўсё проста і з рэгістрацыяй вас у кватэры цёткі. У мясцовай адміністрацыі трэба спачатку ўдакладніць, ці хапае ў гэтай кватэры метраў для вашай рэгістрацыі, або можа існуюць нейкія іншыя нюансы, якія абмяжоўваюць такую «прапіску».

**Раман Лужынскі,** *Валожынскі раён, вёска Бабовічы:*

***— Я 12 гадоў адпрацаваў на сельгаспрадпрыемстве. У 2007 годзе атрымаў дом ад прадпрыемства, які пабудаваў з выкарыстаннем ільготнага крэдыту банка. Згодна з Указам кіраўніка дзяржавы №97, я павінен заплаціць долю крэдыту, якую не даплаціла банку прадпрыемства. Мы з гэтым згодныя. Аднак, на прадпрыемстве мне прапануюць даплаціць яшчэ розніцу паміж гэтай доляй крэдыту і рынкавым коштам жылля. Чаму так?***

— Дом вы атрымалі ў 2007 годзе, а вырашылі пераафарміць на сваё імя толькі цяпер? Але за гэты час прадпрыемства частку доўга за вас ужо аплаціла. Больш таго, вагу грошай за 9 гадоў часткова «з'ела» інфляцыя. Таму зразумела, што прадпрыемства жадае атрымаць за гэты дом пэўную кампенсацыю. Гэта з пункту гледжання логікі.

Калі разглядаць непасрэдна нормы згаданага ўказа, то трэба дасканала разбірацца ў канкрэтнай сітуацыі. Распрацоўшчыкам Указа №97 з'яўляецца Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Таму, калі ў вас ёсць нейкія спрэчныя моманты з яго трактаваннем, а на месцы слушныя тлумачэнні атрымаць складана, трэба звярнуцца з адпаведным лістом у Мінсельгасхарч.

## Адзіны аб'ект нерухомасці

**Мікалай Іваноў,** *Гродзенская вобласць, вёска Зелянец:*

***— У мяне ўчастак памерам 15 сотак. Я ўжо не малады і здароўе ўжо не тое. Гатовы аддаць 10 сотак бясплатна. Тут у мяне толькі адна ўмова — каб новы ўласнік і на маіх сотках дапамагаў траву пакасіць. Што мне рабіць і куды звяртацца?***

— Незалежна ад таго, якім чынам вы валодаеце сваім участкам (пажыццёвае карыстанне з правам перадачы ў спадчыну ці на праве ўласнасці), варыянт будзе толькі адзін. Трэба звяртацца ў мясцовы выканкам з заявай аб адмове ад часткі зямельнага ўчастка. Калі такі надзел зямлі будзе па заяве адабраны ў землеўладальніка, то потым такі ўчастак мясцовымі ўладамі можа перараразмяркоўвацца іншым людзям. Іншыя варыянты тут немагчымыя.

***— Чаму?***

— Нават калі ўчастак знаходзіцца ў прыватнай уласнасці і быў дадзены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, то дзяліць яго можна толькі ў выпадку дзялення і самога дома. Пусты ўчастак такой зямлі прадаваць ці дарыць наша заканадаўства не дазваляе.

**Антаніна Іванаўна,** *Мінская вобласць:*

***— У маёй матулі ў вёсцы Сёмкава (Мінскі раён) па спадчыне ёсць палова дома і 12 сотак зямлі. Дом ужо стары і выкарыстоўваецца як летняя дача. Калі мама мне падорыць гэтую палову дома, то ці змагу я потым на 12 сотках пабудаваць сабе новы дом?***

— На ўчастку, які быў прадастаўлены для будаўніцтва дома, можа знаходзіцца толькі адзін жылы дом. На гэтай зямлі ўзвесці нейкую гаспадарчую пабудову ў выглядзе летняй кухні прынцыпова магчыма. Аднак папярэдне трэба звярнуцца ў мясцовы выканкам і аддзел архітэктуры па адпаведны дазвол. Але... Тут трэба разумець, што пабудаваны новы аб'ект статусам жылога дома валодаць не будзе. А гэта значыць, што на плошчах гэтага памяшкання вас ніхто не зарэгіструе.

Ёсць і другі варыянт вырашэння падобнай праблемы. Уласнік гэтай паловы дома можа звярнуцца з заявай у выканкам па дазвол аб правядзенні рэканструкцыі жылога дома і ўзвядзення прыбудовы. Канчатковае рашэнне аб магчымасці і мэтазгоднасці такога будаўніцтва прымаецца спецыялістамі непасрэдна на месцы вызначанай нерухомай маёмасці.

## Дакумент не перашкодзіць

**Уладзімір Гузоўскі,** *Гродзенская вобласць:*

***— Яшчэ ў часы СССР я купіў жылы дом. Здзелка была праведзена правільна, а бюро тэхнічнай інвентарызацыі зарэгістравала пабудову на праве прыватнай уласнасці. Тады лічылася, што зямельны ўчастак пад домам даецца ўласніку на законнай падставе, бо рашэння выканкама аб прадастаўленні зямлі не патрабавалася. У тэхнічным пашпарце дома ад 1978 года існуе схематычны план участка, дзе прапісаны яго памеры і плошча. Ці павінна цяпер БРТІ выдаць мне пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі зямельнага ўчастка без правядзення адпаведнай працэдуры?***

— Не. Тэхнічны пашпарт пабудовы ніколі не быў дакументам, які пацвярджае права на зямельны ўчастак. Таму тая схема ў тэхпашпарце ніколі і не з'яўлялася прававым дакументам на зямлю. Вам неабходна звярнуцца з адпаведнай заявай у выканкам і прайсці ўсю неабходную працэдуру прадастаўлення зямельнага ўчастка для абслугоўвання жылога дома.

**Антон Муха,** *горад Мінск:*

***— Я тут чуў, што цяпер прадаць сваю дачу ў садаводчым таварыстве сталічнага рэгіёна не змогуць тыя ўласнікі, якія зарэгістравалі гэтую маёмасць менш за 5 гадоў таму. А мне тут прапануюць зрабіць цікавую здзелку па дачы, але паабяцалі аформіць яе крыху пазней. Неяк мне боязна...***

— Пазней, гэта калі?

***— Калі пройдуць гэтыя 5 гадоў пасля рэгістрацыі.***

— А як вам прапануюць аформіць здзелку зараз? За грошы дадуць распіску і пісьмова паабяцаюць аформіць дачу на ваша імя праз два гады? Наступствы такой здзелкі могуць быць зусім сумнымі. Ужо цяпер валоданне такой дачай будзе лічыцца парушэннем заканадаўства. А калі ўзнікнуць спрэчныя пытанні з суседзямі...

Галоўнае, што вы павінны разумець — пасля таго, як прадавец атрымае ад вас грошы сёння, ніхто не прымусіць гэтага ўласніка праз вялікі прамежак часу заключыць канчатковы дагавор.

***— Тады я лепш пачакаю. Дзякуй вам за параду.***

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Узровень

# НАСУПЕРАК ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

## ЗАЎТРА Ў МІНСКУ ПАЧНЕЦЦА ПЕРШЫ МІЖНАРОДНЫ НАВУКОВЫ КАНГРЭС БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

**У форуме прымуць удзел больш за 330 вучоных з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Вялікабрытаніі, Ірана, ЗША, Літвы, Аўстрыі, Японіі, Славакіі, Кітая. Падчас пленарнага і секцыйных пасяджэнняў яны абмяркуюць актуальныя пытанні захавання беларускай культурнай спадчыны, падзяляцца вынікамі ўласных навуковых даследаванняў. У якасці арганізатараў кангрэса выступаюць Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН, Міністэрства культуры краіны.**
**Падрабязна пра канцэпцыю кангрэса і яго мэты карэспандэнту «Звязды» паведаміў дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар архітэктуры, доктар гістарычных навук, акадэмік Аляксандр ЛАКОТКА.**



***— Аляксандр Іванавіч, якое месца будзе займаць кангрэс у шэрагу традыцыйных навуковых мерапрыемстваў? Якія мэты ставіць перад сабой такі прадстаўнічы форум?***

— Навуковыя даследаванні ў галіне культуры і суправаджэння культуры традыцыйна праводзяцца ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ужо шмат гадоў сумесна з Міністэрствам культуры выконваем пагадненне і маем праграму супрацоўніцтва. А паколькі гэты год аб'яўлены ў нашай краіне Годам культуры, арганізацыя вялікага кангрэса бачыцца выдатнай магчымасцю абмеркаваць самыя разнастайныя праблемы культуры. Штогод мы праводзім канферэнцыі, творчыя семінары, «круглыя сталы», але кангрэс — арганізацыйна больш складаная форма, ён ставіць мэтай даць магчымасць не толькі выказаца навукоўцам, паназнёміць шырокае кола ўдзельнікаў з новымі вынікамі даследаванняў, але і правесці сумоўе з творчымі работнікамі, з тымі, хто працуе ў тэатры і кіно, у галіне жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у літаратуры.

***— Гаворку пра культуру немагчыма ўявіць без неапрэднага знаёмства са здабыткамі ў розных яе галінах...***

— Сапраўды. Таму акрамя навуковых дакладаў, форум прадугледжвае і шырокую навукова-культурную праграму. Госці з замежжа наведаюць інстытуты Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, пазнаёмяцца з вынікамі даследаванняў у галіне гісторыі, археалогіі, мастацтвазнаўства, этналогіі, фальклорыстыкі, мовы, літаратуры, сацыялагічныхі даследаванняў у галіне культуры. Яны наведаюць мастацкі і гістарычны музеі, пазнаёмяцца з новай экспазіцыяй музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнай бібліятэкай.

***— У наш час вельмі шмат гавораць пра значнасць захавання культурнай разнастайнасці свету, своеасаблівую антыглабалізацыю. Ці сугучныя мэты форуму гэтым працэсам?***

— Так, ва ўмовах глабалізацыі паўстае праблема захавання самабытных нацыянальных культур, што павышае важнасць і навуковага суправаджэння культуры. Мы бачым, як, напрыклад, у Еўрапейскім саюзе, дзе ісце адзіная валюта, эканамічная прастора, рынак, кожная краіна вельмі заклапочана захаваннем сваіх нацыянальных культурных адметнасцяў. Таму надзвычай важнай бачыцца праграма ЮНЕСКА, скіраваная на захаванне культурнай і моўнай разнастайнасці. Актуальным падчас кангрэса будзе абмеркаванне праблем развіцця беларускай мовы, захавання яе дыялектнай разнастайнасці, збераджэння нашай літаратурнай спадчыны, помнікаў пісьменства. Вострай праблемай сёння з'яўляецца суадноснасць сучаснай архітэктуры і гісторыка-архітэктурных помнікаў, аб'ектаў сядзібна-паркавага мастацтва. Неабходна агучыць пытанні, вельмі актуальныя для даследавання карагнёвай культуры беларусаў, нашай літаратуры і выяўленчага мастацтва.

***— Ці многа на кангрэсе новых удзельнікаў, незнаёмых імёнаў?***

— Навуковыя напрацоўкі, фундаментальныя даследаванні стварыюцца гадамі. І за доўгі час ужо сапраўды склаўся кантынгент нашых сяброў-навукоўцаў як у Беларусі, так і за мяжой. Яны ўжо шмат гадоў працуюць у кірунку даследавання беларускай культуры, прымаюць удзел у нашых канферэнцыях. Але час ідзе, і, безумоўна, з кожным годам з'яўляюцца новыя сябры. На сёлетнім кангрэсе — каля палова новых удзельнікаў. Магчыма, іх прывабіў менавіта шырокі маштаб кангрэса, яго грамадскі рэзананс, але і нам заўсёды прыемна прымаць новых даследчыкаў у кола сяброў Беларусі.

***— Можна сцвярджаць, што цікавасць да нашай краіны, культуры, мовы сёння павышаецца?***

— Да беларускай мовы і культуры ў замежных даследчыкаў цікавасць была заўсёды. Іншая справа, што магчымасці мець агульныя праекты, праводзіць сумесныя даследаванні, удзельнічаць у канферэнцыях сёння большыя. Традыцыі аўтэнтычнай культуры з'яўляюцца прадметам пастаяннай цікавасці беларускай дыяспары ў замежжы, якая налічвае некалькі мільёнаў чалавек. Яшчэ адна з прычын заключаецца ў тым, што Беларусь стала адным з актыўных дыпламатычных удзельнікаў у свеце. З аднаго боку, нашы дыпламатычныя прадстаўніцтвы актыўна працуюць у галіне пашырэння звестак пра беларускую культуру. А з іншага — натуральны і лагічны працэс культурнага знаёмства адбываецца паралельна з тымі крокамі, якія робіць кіраўніцтва нашай дзяржавы, пашыраючы вектары эканамічнага, дзелавога супрацоўніцтва з замежнымі краінамі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*



■ Жыллё мае

# ЖЫРОЎКІ ПАДКАЖУЦЬ, ЯК СЭКАНОМІЦЬ

## Пра субсідыі, звышнарматывы і «зайцоў» без рэгістрацыі

**Выгляд новых паведамленняў на аплату паслуг ЖКГ, якія беларусы атрымаюць у маі, будзе аднолькавым для дамоў па ўсёй краіне, незалежна ад тыпу абслугоўвання. У жыроўках асобным блокам будзе ўказана, што жыхары аплачваюць па поўным тарыфе. Гэта дазволіць грамадзянам вырашаць, на чым эканоміць. А ў пустых кватэрах з'явяцца «ўяўныя» жыхары, колькасць якіх вылічаць праз метраж памяшканняў.**





Колькасць метраў, аплата за якія налічваецца па субсідаваных дзяржавай тарыфах разлічваецца па прынцыпе 20 м² на кожнага прапісанага плюс 10 м² на сям'ю. «Лішнія» метры грамадзяне будуць аплачваць па поўным (эканамічна абгрунтаваным) тарыфе, згодна з адпаведнай пастановай урада.

Напрыклад, у кватэры памерам 76 м² з трыма жыльцамі па субсідаваных тарыфах будзе аплачвацца 70 метраў. Тэхнічнае абслугоўванне астатніх 6 м² разлічаць па поўнай і прапішуць асобна ў графе з лічбамі, якія налічваюцца за звышнарматыўнае карыстанне. Перарасход паслуг можа таксама атрымацца праз празмернае карыстанне вадой (у радках «халоднае водазабеспячэнне» і «водаадвядзенне» (каналізацыя), калі вылівалі больш за 140 літраў у суткі на чалавека.

### УЯЎНЫЯ ЖЫЛЬЦЫ

Плата за пустыя кватэры, дзе ніхто не прапісаны, таксама будзе налічвацца па-іншаму. Агульную плошчу пустой кватэры падзеляць на належныя на асобу 20 м² з акругленнем на карысць гаспадара. Выніковая лічба будзе адпавядаць прыкладнай колькасці чалавек, якія маглі б пражываць у гэтым памяшканні. Так, у кватэры памерам 73,2 м² «паселяцца» тры чалавекі. Зыходзячы з гэтага, адлічэнні па субсідаваных тарыфах на тэхабслугоўванне ліфта і прыбіранне дамавых памяшканняў у кватэры, дзе ніхто не прапісаны, будуць памножаны на трох асоб. Аплата электраэнергіі, якая затрачваецца на асвятленне дапаможных памяшканняў і працу абсталявання (за выключэннем ліфта), таксама павялічыцца на трох. Па поўным кошце налічаць сумы за тэхнічнае абслугоўванне і ацяпленне ўсіх 73,2 м² кватэры.

— Калі казаць пра сацыяльную справядлівасць, то бюджэт павінен субсідаваць чалавека адзін раз. А калі ў цябе шмат кватэр, то атрымліваецца, што дзяржава пры набыцці кожнага новага памяшкання праз субсідаваныя тарыфы на аплату паслуг працягвае дапамагаць, — расказаў **Алег ПАСКРОБКА, першы намеснік міністра ЖКГ,** які прадставіў новыя формы жыровак. — Як член сумеснага домаўладання чалавек абавязаны несці расходы па ўтрыманні агульнай маёмасці. Ты можаш прапісацца ў адной кватэры і частку метражу аплачваць па зніжаных тарыфах, у астатніх кватэрах метры таксама павінны аплачвацца, зыходзячы з параметраў памяшкання.

### ЭКАНОМНЫЯ ТАРЫФЫ І НЕАФІЦЫЙНЫЯ ЖЫХАРЫ

Жыроўка будзе друкавацца на аркушы фармату А4. На яе адваротным баку змесціцца інфармацыя пра фактычныя затраты ўсяго дома: плошча жыллёвых і дапаможных памяшканняў, колькасць зарэгістраваных па доме жыхароў і тых, на каго налічваецца плата за паслугі. Нагадаем, што дзеці да сямі гадоў вызвалены, напрыклад, ад аплаты паслуг за карыстанне ліфтам. Хоць многія таварыствы ўласнікаў такім рашэннем былі незадаволеныя, бо некаторыя шматпавярховікі праз гэта пачалі не ўкладвацца ў сумы аплаты за карыстанне электраэнергіяй і ліфтам.

Застаюцца ў грамадзян і іншыя пытанні па налічэнні аплаты за паслугі ЖКГ, прынамсі, за вываз смецця ці аплату асвятлення месцаў агульнага карыстання. Участковыя пачалі выяўляць людзей, якія жывуць у кватэры, але не зарэгістраваны ў ёй. А гэтыя неафіцыйныя жыхары і ліфтам карыстаюцца, і смецце пакідаюць, — акрэсліў Алег Паскробка і дадаў:

— Цяперашнія тарыфы аптымальна разлічаны ў рэжыме сур'ёзнай эканоміі. І многія ўжо адзначаюць, што ўсталёўваюць прыборы ўліку, энергазберагальныя лямпачкі. Праўда, здараюцца і перагібы. Людзі ўбачылі, што плацяць за святло больш, і пачалі выключаць яго на ноч паўсюдна, нават крыху адкручваць лямпачку ў ліхтары перад уваходам у пад'езд. А міліцыя стала штрафаваць ЖЭСы за цёмныя месцы перад уваходнымі групамі ў пад'езд. Таму каб менш паліць, пачалі скарыстоўваць святлодыёдныя свяцільні. Адзінае, на што немагчыма паўплываць, — пераплата за вялікі метраж. У гэтым выпадку, каб сэканоміць, давядзецца мяняць кватэру на меншую.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# НА РАДУНІЦУ — ЧАСОВЫЯ МАРШРУТЫ

**У сувязі з масавымі наведваннямі могілак у перыяд з 7 па 10 мая дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» традыцыйна арганізуе працу шэрагу часовых гарадскіх аўтобусных маршрутаў.**

7-9 мая: №970Э «АС «Паўднёва-Заходняя» — Заходнія могілкі»; №972Э «ДС «Уручча-2» — Каладзішчанскія могілкі»; №973Э «ДС «Захад-3» — Паўночныя могілкі»; №975Э «ДС «Чыжоўка — могілкі «Міханавічы». Таксама будзе павялічана колькасць рухомага саставу на дзеючых гарадскіх аўтобусных маршрутах: №68 «ДС «Карастаянавай» — Паўночныя могілкі; №94С «АС Аўтазаводская» — Чыжоўскія могілкі»; №109 «ДС «Карбышава» — Паўночныя могілкі».

10 мая: №968Э «ДС «Карастаянавай» — Паўночныя могілкі»; №970Э «АС «Паўднёва-Заходняя» — Заходнія могілкі»; №971Э «ДС «Захад-3» — могілкі «Міханавічы»; №972Э «ДС «Уручча-2» — Каладзішчанскія могілкі»; №973Э «ДС «Захад-3» — Паўночныя могілкі»; №974Э «Кульман — Паўночныя могілкі»; №975Э «ДС «Чыжоўка» — могілкі «Міханавічы»; №976Э «ДС «Дружная» — Паўночныя могілкі»; №977 «1-я вароты — 2-я вароты» (для абслугоўвання Паўночных могілак); №979Э «ДС «Карбышава» — Паўночныя могілкі». Таксама будзе павялічана колькасць рухомага саставу на аўтобусных маршрутах: №31 «ДС «Уручча-2» — Каладзішчанскія могілкі» (з адначасовай адменай аўтобуснага маршруту №172Э); №94С «АС «Аўтазаводская» — Чыжоўскія могілкі».

З мэтай мінімізацыі часу праезду да месцаў адпраўлення гарадскіх і прыгарадных аўтобусных маршрутаў, якія забяспечваюць транспартнае абслугоўванне месцаў пахавання, 10 мая ў перыяд з 7.00 да 20.00 будзе запланавана: павелічэнне колькасці рухомага саставу на аўтобусных маршрутах №№3С, 29, 59, 148С, 921, 941, тралейбусных маршрутах №№2, 22, 25, 46, 92 і трамвайным маршруце №11; арганізацыя работы часовага аўтобуснага маршруту №22Д «ДС «Чыжоўка» — ст.м. Аўтазаводская».

10 мая ў сувязі з закрыццём руху ўсіх відаў транспарту па вуліцы Кульман з-за арганізацыі масавых перавозак пасажыраў да месцаў пахавання рух аўтобуснага маршруту №19 «ДС «Карастаянавай» — Сляпянка» будзе арганізаваны па вуліцах Карастаянавай, Арлоўскай, плошчы Бангалор, вуліцы М.Багдановіча з выкананнем прыпыначнага пункта «Пл. Бангалор» у абодвух напрамках.

Аплата за праезд на маршрутах №№22Д, 68, 94С, 109, 977 будзе брацца па гарадскім звычайным тарыфе, на маршрутах №№968Э, 970Э, 971Э, 972Э, 973Э, 974Э, 975Э, 976Э, 979Э — па гарадскім экспрэсным тарыфе ў прамым і зваротным кірунку пры пасадцы ў аўтобусы ў Мінску.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Звыш арэнды

**Пракуратурай Мінскай вобласці накіравана ў суд крымінальная справа ў дачыненні кіраўніка аднаго з сельгаспрадпрыемстваў Стаўбцоўскага раёна. Ён абвінавачваецца ў вымаганні хабару і крадзяжы маёмасці прадпрыемства.**

За прадастаўленне ў арэнду зямлі дырэктар сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва патрабаваў ад кіраўніка фермерскай гаспадаркі грашовыя сродкі ў памеры 50% ад рэалізацыі бульбы.

У момант атрымання «ўзнагароджання» — 20 тыс. долараў — мужчына быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі.

— Устаноўлены і іншыя факты яго злачыннай дзейнасці, — паведаміў **намеснік начальніка аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Мінскай вобласці Ігар БЫЧКО.** — У прыватнасці, за некалькі дзён да арышту ён атрымаў хабар у памеры 500 долараў ад кіраўніка камерцыйнай структуры за спрыяльнае рашэнне пытання аб аплаце прадпрыемствам раней пастаўленага камбікорму.

Акрамя таго, былы дырэктар неаднаразова даваў указанні падначаленым браць без афармлення на аўтазаправачнай станцыі паліва і перадаваць асабіста яму, тым самым учыняючы крадзеж маёмасці прадпрыемства.

Абвінавачваны заключаны пад варту. Паўторнае атрыманне службовай асобай хабару ў асабліва буйным памеры прадугледжвае пазбаўленне волі да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Канікулы без праблем

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кожны з бацькоў мусіць ведаць, дзе знаходзіцца іх дзіця і чым у гэты час займаецца. Таму лепш ужо зараз правесці прафілактычную гутарку і абыграць усе магчымыя сітуацыі. Дома небяспеку ў сябе хаваюць электрычныя прыборы. Трэба як мага далей прыняць інструменты, якія ў неспрактыкаваных руках могуць нанесці вельмі моцную траўму.

Асабліва пільнымі мусяць быць жыхары мясцовасцяў, дзе ідуць якія-небудзь будоўлі ці, напрыклад, пракапаны траншэі дзеля рамонту труб. Малых гэтыя аб'екты прываблiваюць, але растлумачце ім, чаму туды хадзіць нельга. Пэўную небяспеку хаваюць у сябе закінутыя дамы. Дзеці туды любяць хадзіць гуляць, але ж не ўлічваюць таго, што канструкцыі могуць абваліцца ў любы момант.

І нават у звычайных дварах у шматпавярховых кварталах хаваецца небяспека. Часта дзіцячыя пляцоўкі аддзелены ад уваходу ў пад'езд праездам, запаркаваным аўтамабілямі з абодвух бакоў. Таму растлумачце малому, як трэба правільна пераходзіць праезную частку — з-за вышыні аўтамабіля кіроўца рызыкуе заўважыць дзіця вельмі позна.

— Таксама раскажыце пра тое, што не варта браць незнаёмыя прадметы, — раіць Крысціна Зайцава. — Успамінаецца выпадак, які здарыўся ў Бабруйску. Некалькі гадоў таму хлопчыкі знайшлі нейкую банку. Адкрылі яе, а там аказаўся порах. Дапытлівыя малыя вырашылі паглядзець, як ён загарыцца. Кінулі запалку — і тут жа раздаўся выбух. Дзеці тады атрымалі сур'ёзныя апёкі...

### «ЗАЧЭПІНГ» ДЛЯ БЕЛАРУСІ НЕ АКТУАЛЬНЫ»

Перамена абстаноўкі для гарадскіх дзяцей, якія прыехалі на тры месяцы ў вёску, вельмі ўражлівая. Тут табе і рэчка, і лес, і вялікія прасторы палёў. І гэта стварае ілюзію разняволенасці. Якая, аднак, можа скончыцца трагедыяй.

Летась у жніўні драма разыгралася на вадасховішчы паблізу вёскі Смолічы. Трохгадовы хлопчык і 16-гадовая дзяўчына адпачывалі разам з маці. Малы сядзеў на надзіманым матрацы. І ў нейкі момант парыў ветру аднёс матрац ад берага. Дзяўчына гэта заўважыла і паплыла ўслед за ім. За трыццаць метраў ад берага яна дагнала брата, але ўтрымаць яго не змагла. Імгненне — і абодва апынуліся пад вадой. Маці дапамагчы не змагла — яна не ўмела плаваць...

— Нельга выходзіць на ваду на самаробных плавальных сродках. На вадаёмах дзеці тонуць з-за таго, што яны там прадастаўлены самі сабе. Да таго ж у хлопчыкаў існуе дух спаборніцтва — напрыклад, хто далей праплыве. Але пры гэтым яны не разлічваюць свае сілы. Не ведаючы мясцовасці, яны не зважаюць на асаблівасці плыні, не разлічваюць тое, што ў дне вадаёма могуць быць глыбокія ямы. Таму лепш ісці адпачываць у дазволеныя праверанья месцы, дзе абсталяваны пляжы, і толькі пад наглядам дарослых.

Пры дзіцячым адпачынку на сельскай мясцовасці сур'ёзнай небяспекай для жыцця становіцца навальніца. У горадзе гэтая праблема вырашаецца проста: месцаў, дзе можна перачакаць непагадзь, вельмі шмат: крамы, грамадскі транспарт, фае. А вось у вёсцы бліжэйшая пабудова можа быць і за некалькі кіламетраў. Былі выпадкі, калі электрычныя разрады забівалі дзяцей у палатках.

— Нельга хавацца ад навальніцы пад асобнымі дрэвамі. Лініі электраперадачы таксама могуць прыцягнуць да сябе маланку. А што ж рабіць у полі, дзе ўвогуле няма дзе прыхінуцца? Калі чалавек проста стаіць, то ён з'яўляецца самай высокай кропкай, якая і можа прыцягнуць разрад па аналогіі з адзінокім дрэвам. Таму трэба прыняць позу «эмбрыёна» — прысесці на кукішкі, абняць рукамі калені і перачакаць дождж. Перад тым на зямлю лепш падсцяліць куртку. Уцячы ад навальніцы лепш не спрабаваць: прадметы, якія рухаюцца, прыцягваюць да сябе разрад. Мабільны тэлефон лепш выключыць на час непагадзі і нават выцягнуць батарэйку.

У суседняй Расіі сярод падлеткаў моцна распаўсюдзіўся так званы «зачэпінг». Падлеткі ў пошуках моцных адчуванняў чапляюцца за цягнікі звонку і так падарожнічаюць на далёкія адлегласці, нягледзячы на рызыку зваліцца пад колы падчас руху.

— На шчасце, у нас гэтая практыка не прыжылася. А вось экстрэмальныя «сэлфі» (самавыявы з дапамогай мабільнага тэлефона) нашы падлеткі рабіць спрабавалі. Нагадаем хоць бы пра выпадак у Пружанах, які здарыўся летась у жніўні. Дзевяцікласніца залезла на дах цягніка і атрымала магутнейшы ўдар токам ад кантактнай сеткі. Мы пасля гэтага выпусцілі відэаролік пра тое, як трэба рабіць сэлфі бяспечна. Пры кожнай гутарцы з дзецьмі звяртаем на гэта ўвагу. І больш такіх выпадкаў не было.

### КАБ НЕ ЗАБЛУКАЦЬ У ЛЕСЕ

Летась у Бярэзінскім раёне ў лесе згубіўся чатырохгадовы хлопчык. Перад тым маці малога сама пайшла ў лес, а сына пакінула разам з 16-гадовай дачкой. Калі маці прыйшла дадому, малога там ужо не было. Дачка расказала, што ён пайшоў гуляць да суседзяў. Маці кінулася ў двор да іх, але і там малы не знайшоўся. Кабета прыгадала, што сын хацеў сустрэць яе на ўзлеску. Жанчына пабегла туды і знайшла там веласіпед сына. Пачала крычаць, але хлопчык не адгукаўся.

...Яго некалькі гадзін шукалі міліцыянеры, леснікі і мясцовыя жыхары. Толькі а дзясятай гадзіне вечара небараку знайшлі амаль за два кіламетры ад узлеску, на якім ён пакінуў веласіпед. Малы сказаў, што толькі хацеў паесці ягад.

— Таму не трэба пакідаць дзяцей без нагляду, — аналізуе сітуацыю Крысціна Зайцава. — Але з імі ўсё роўна трэба пагутарыць і на гэтую тэму. Негатыўную ролю адыгрывае псіхалагічны фактар: дзеці баяцца, што пасля на іх дома будуць сварыцца за тое, што пайшлі ў лес у адзіночку. Таму малы можа сядзець у лесе гадзінамі, чуць, як яго клічуць, але не адгукацца. Растлумачце яму, што заблукаць можа кожны чалавек, дарослы ці дзіця, што не трэба саромецца пазваніць па тэлефоне ў такой сітуацыі, калі сігнал ловіцца. І што б ні здарылася, вы абавязкова пачняце шукаць яго.

Але што рабіць, калі мабільны тэлефон не працуе і палянкі побач няма? Тут толькі застаецца выбірацца самому. Праўда, на сваім шляху пажадана пакідаць зарубкі ці заломкі на дрэвах. Гэтыя знакі дапамогуць пошукавай групе вас знайсці хутчэй. Людзі, якія шукаюць малога ў лесе, рухаюцца вельмі павольна, бо шукаюць разнастайныя сляды. Акрамя таго, гэты просты метад дазволіць не збіцца з курсу. У чалавека звычайна правая нага робіць крыху большыя крокі ў лесе. На дарогах гэтая асаблівасць не адчуваецца — на падсвядомым узроўні мы карэктуем крок міжвольна. А вось у лесе арыенціраў такіх няма. Таму гэтыя зарубкі дазволяць не апісваць гадзінамі адну і тую ж акружнасць радыусам у некалькі кіламетраў.



**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*


**КУП «Минсксанавтотранс»**
**проводит 23.05.2016 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 25 в 11.30**

**АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ АВТОМОБИЛЕЙ:**

**1. ВАЗ-2106 г.в. 2006 пробег 186018 км,**
требует ремонта двигателя и кузова, некомплектный.
Начальная цена 8 419 100 руб. Размер задатка 841 900 руб.

**2. ГАЗ 310231 г.в. 2006, пробег 252401 км,**
требует ремонта двигателя и кузова, некомплектный.
Начальная цена 15 391 300 руб. Размер задатка 1 539 100 руб.

**3. ДЭУ Ланос г.в. 2008, пробег 132400 км,**
требует ремонта двигателя и кузова, некомплектный.
Начальная цена 17 278 400 руб. Размер задатка 1 727 800 руб.

Справки по тел. 017-2840961. УНП 100029143



Извещение о проведении 22 июня 2016 года открытого аукциона по продаже имущества ИЗАО «Евротрансэнерго»

Предмет аукциона

| Лот №1 |
| --- |
| Незавершенное законсервированное капитальное строение «Нефтепродуктопровод «Гершоны-Малашевиче» (инвентарный номер 100/U-59521). Общая протяженность 961 м. Нефтепродуктопровод состоит из двух ниток и кожуха под кабель связи. Протяженность первой нитки на территории Республики Беларусь – 333 м, второй нитки – 318 м. Протяженность кожуха под кабель связи – 310 м. Земельного участка не занимает, так как объект расположен под землей. Местонахождение – Республика Беларусь, Брестская обл., Брестский район. Начальная цена – 31 000 000 000 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20% Сумма задатка – 50 000 000 белорусских рублей Обременение – нет |
| **Лот №2** |
| Герметизирующая резиновая манжета ПМТД 273 – 2 шт. Начальная цена – 30 196 500 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20% Сумма задатка – 1 000 000 белорусских рублей Обременение – нет |
| **Лот №3** |
| Кольцо опорно-направляющее ПМТД 273 – 149 шт. Начальная цена – 613 000 000 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20% Сумма задатка – 6 000 000 белорусских рублей Обременение – нет |
| **Лот №4** |
| Оголовок для трубопровода ПМТД 273 – 1 шт. Начальная цена – 10 000 000 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20% Сумма задатка – 1 000 000 белорусских рублей Обременение – нет |

**Продавец (собственник) имущества – ИЗАО «Евротрансэнерго», 220007, г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А, телефон (017) 222 03 19.**

**Организатор аукциона – ИЗАО «Евротрансэнерго», 220007, г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А, телефон (017) 222 03 19.**

Условие аукциона – победитель аукциона (покупатель) возмещает организатору аукциона фактические затраты на организацию и проведение результативного аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ИЗАО «Евротрансэнерго», утвержденным организатором аукциона. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету аукциона, а также представившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором аукциона); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет ИЗАО «Евротрансэнерго» № 3012006746018 в «Приорбанк» ОАО г. Минск, ЦБУ 113, код 153001749, УНП 190475731 не позднее окончания срока приема документов на участие в аукционе. В платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток для участия в аукционе, проводимого 22.06.2016, по лоту №__ согласно Условиям проведения аукциона от 29.04.2016 с НДС».*

Торги проходят в форме открытого аукциона с применением метода понижения начальной цены. Шаг аукциона на понижение – 15 (пятнадцать процентов) от начальной цены Лота. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена понижается аукционистом до тех пор, пока только один из участников согласится приобрести предмет аукциона. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС. Цена продажи не может быть менее минимальной цены, установленной собственником имущества перед проведением аукциона. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы возмещения фактических затрат по организации и проведению аукциона и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **90 (девяноста) банковских дней** после заключения договора купли-продажи.

**Аукцион проводится 22 июня 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **по 21.06.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А.

**Телефоны для справок: (017) 222 03 19 (ИЗАО «Евротрансэнерго»).**

■ Год культуры

# ЯКУЮ КНІГУ ВЫБЕРА ЧЫТАЧ...

**За лічбамі, якія ўражваюць пры размове пра колькасць назваў выдадзеных у Беларусі кніг, хаваецца няпростая работа пісьменнікаў і выдаўцоў, друкароў і кнігагандляроў. Дзясяткі айчынных выдавецтваў імкнуцца быць заканадаўцамі аднае і тае ж моды — «моды на чытанне». Пра тое, якія рыфы, падводныя камяні чакаюць па дарозе да сцвярджэння гэтай моды, наш карэспандэнт гутарыць з дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесем БАДАКОМ.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Айчынная кніга яшчэ выходзіць у папяровым фармаце. У інтэрнэце не так шмат беларускіх кніг прадстаўлена выключна электроннымі версіямі. Значыць, друкаваная кніга будзе жыць на Беларусі яшчэ як мінімум стагоддзе?***

— Цяжка спрагназаваць, нават проста ўявіць, што будзе праз сто гадоў з электроннай кнігай — сёння тэхнічна ўсё так імкліва развіваецца! Але калі дапусціць, што ў плане функцыянальнасці электроннай кнігі на працягу ста бліжэйшых гадоў нам нічога каардынальна новага не прапануюць (хоць гэта наўрад ці), то, безумоўна, яна не зможа цалкам выціснуць папяровую кнігу. Як тэлевізар плюс кіно, а сёння яшчэ і плюс інтэрнэт, не замянілі тэатр. Здавалася б, гэта ж такі кайф: сядзі сабе дома ў крэсле, цісні на кнопкі, выбірай фільм на любы густ, нават спектаклі. Праўда, спектакляў на тэлеканалах якраз мала, таму што ў іх малыя тэлерэйтынгі. А чаму? Таму што той, хто па-сапраўднаму любіць іх, ідзе ў тэатр, дзе своеасаблівая энергетыка, таму што тэатр — гэта нешта значна большае, чым проста дзеянне на сцэне, больш жывое, натуральнае і, як кажа Алена Мальчэўская, «гэта тое, што ўзнікае тут і цяпер, фіксаваць яго немагчыма». У фільме можна рабіць бясконцую колькасць дубляў і пасля выбраць з іх адзін, той, які, напрыклад, на думку рэжысёра, найлепш адлюстроўвае пачуцці героя. У тэатры можна праводзіць сотні рэпетыцый адной і той жа сцэны, але нельга з іх «выразаць» лепшы «дубль» для гледача. Пяпяровая кніга таксама больш натуральная, больш рэальная і, я сказаў бы, адушаўлёная ў параўнанні з электроннай чыталкай, у якой можна і праўкі ў тэкст пры жаданні ўносіць, і шрыфт мяняць — ёсць адчуванне нейкай незавершанасці, што цалкам выключае такое, напрыклад, паняцце, як рарытэтнае выданне. Дзясяткі тысяч раманаў на карце памяці памерам з пазногаць — яно, вядома, здорава, але гэта як выбіраць паміж звычайным чалавекам і робатам.

Таму, мне здаецца, папяровая кніга і праз сто гадоў не знікне. Іншая справа, калі мы гаворым пра бульварную літаратуру, увогуле пра кнігі, да якіх, прачытаўшы раз, ты ведаеш, што да іх ужо не вернешся. Тут электронныя чыталкі вельмі дарэчы. Ці я, напрыклад, з іх дапамогай знаёмлюся з сусветнымі кніжнымі навінкамі. Прачытаеш старонак дзесяць і разумееш — да гэтай кнігі ты яшчэ захочаш вярнуцца не раз. Тады ідзеш у кнігарню і набываеш яе папяровую версію. Таму, дзякуючы электроннай чыталцы, мая дамашняя бібліятэка расце значна хутчэй, чым гэта было раней.

***— І ўсё ж — якія планы выдавецтва «Мастацкая літаратура» ў развіцці электроннага кнігавыдання?***

— Пакуль наш асноўны прынцып: праз інтэрнэт — на нашым сайце, у сацыяльных сетках — прыцягнуць увагу чытача да папяровай кнігі. Мы аператыўна выкладваем вокладкі, анатацыі да новых кніг, расказваем, дзе набыць, і г.д. Сёння мы яшчэ не гатовы прапаноўваць чытачу за пэўную плату набыць паўнавартасныя электронныя варыянты, якія пасля можна будзе загружаць у чыталкі. Дакладней, чытач не зусім гатовы іх набываць, паколькі ў нас пакуль няма культуры кніжнага інтэрнэт-гандлю. Існуе шмат сайтаў, якія скануюць і выкладваюць кнігі розных выдавецтваў бясплатна. Гэта тычыцца і кіно, і музыкі. І змагацца з гэтым вельмі складана. Не так даўно, напрыклад, у Расіі паспрабавалі зачыніць адзін з самых папулярных торэнт-трэкераў. Нічога з гэтага не атрымалася, паколькі ў заканадаўстве ў гэтым плане вельмі шмат дзірак.

Але ніхто не ведае, што будзе з электроннымі кнігамі не тое што праз сто гадоў — праз дзесяць-дваццаць. Можна ж прасачыць на прыкладзе тэлефоннай сувязі: стацыянарны тэлефон, радыётэлефон, пэйджар, мабільнік, смартфон. Каласальныя змены за некалькі дзесяцігоддзяў. І чакаць, што заўтра чалавецтва адмовіцца ад інтэрнэту ці, згаварыўшыся, павыкідае ўсе электронныя чыталкі на сметніцу, каб набываць толькі папяровыя кнігі, наіўна. Электронныя носьбіты інфармацыі будуць развівацца ўсё больш, і нам трэба ісці ў нагу з часам. У дамове з аўтарамі, дарэчы, ёсць пункт, які дазваляе нам выкарыстоўваць тэкст кнігі ў інтэрнэце. Памятаю, адзін з аўтараў сталага веку, азнаёміўшыся з гэтым пунктам, катэгарычна адмовіўся падпісваць дамову. Я здзівіўся: чаму? Адказвае: украдуць плагіятары, а потым скажуць, што гэта іх твор! Тут я здзівіўся яшчэ больш...

***— Алесь Мікалаевіч, а як, на ваш уласны погляд, варта прапагандаваць кнігу, каб ішоў рост яе продажаў?***

— Адказ, думаю, вельмі банальны: усімі магчымымі спосабамі. Праз газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт. Але трэба мець на ўвазе, што майстэрства рэкламы — гэта таксама навука. Нехта можа гадзіну расказваць пра кнігу — і яе не захочацца купляць. А нехта і за пяць хвілін пераканае, што менавіта яе не хапае на тваёй кніжнай паліцы. Аднак перадусім трэба, каб пісаліся і выдаваліся кнігі, якія хочацца чытаць.

На жаль, сёння па творах сучасных беларускіх аўтараў фактычна не здымаюцца фільмы, па дзіцячых кнігах — мультфільмы, на словы прафесійных паэтаў вельмі мала пішацца песень. А гэта была б такая рэклама як твора, так і імя аўтара! Адна з прычын: прадстаўнікі розных творчых прафесій вельмі мала сталі кантактаваць паміж сабой. Напрыклад, я сёння амаль не пішу песень, а калі і пішу, то з кампазітарамі, якія мае равеснікі або старэйшыя за мяне — з тымі, з кім пазнаёміўся гадоў дваццаць — дваццаць пяць таму. З пераважнай большасцю маладых кампазітараў і выканаўцаў мы асабіста не знаёмыя, ды і нагоды для гэтага як бы няма: і тыя, і другія сёння самі пішуць тэксты для сваіх песень і, мяркуючы па ўсім, цалкам гэтым задаволеныя.

***— Ці часта вы бываеце на сустрэчах з чытачамі самі?***

— Імкнуся бываць як мага часцей. І не толькі ў Мінску. І не толькі ў бібліятэках ці школах. Люблю паназіраць за чытачамі ў кнігарнях: каля якіх паліц яны спыняюцца, якія кнігі доўга гартаюць, а якія тут жа ставяць назад на паліцу. Чытач — гэта індыкатар: што сёння найбольш запатрабавана, а што наадварот.

***— А што, калі, напрыклад, выдавецтву «Мастацкая літаратура» стварыць уласную кнігарню і прадаваць там кнігі толькі вашага выдавецтва? Ці гэта крок з разраду фантазійных?***

— У рэкламным плане гэта цудоўна, але нявыгадна ў эканамічным: арэнда, заробак супрацоўнікаў. І што такое адна фірменная кнігарня на ўсю краіну? Гэта калі быў кніжны дэфіцыт, я быў прывязаны да «Кнігарні пісьменніка», бо там можна было заказаць сякія-такія дэфіцытныя кнігі. Ці любіў наведваць «Падпісныя выданні», бо менавіта яны спецыялізаваліся на такой літаратуры. Сёння, каб прывязаць да сябе чытача, трэба прадаваць тое, чаго няма ў іншых кнігарнях, трэба значна пашырыць свой кніжны асартымент, а гэта няпроста.

Але такі крок і да разраду фантазійных я не аднёс бы: усё ж мяняецца...

***— Як вы лічыце, ці ўсё магчымае для прапаганды кніг робяць айчынныя мас-медыя?***

— Прапаганда — паняцце вельмі шырокае, а «ўсё магчымае» — амаль неабдымнае, таму так і хочацца сказаць класічнае: рэзервы для павелічэння ёсць. Але, шчыра кажучы, хацелася б нейкіх вельмі нестандартных хадоў, незвычайных фарматаў — якіх не было дагэтуль і якія прыцягнулі б увагу патэнцыяльных чытачоў. Умоўна кажучы, ну не здымаецца канкрэтна сёння ў нас кінафільм па кнізе сучаснага беларускага празаіка N. з удзелам народнага артыста СССР Генадзя Аўсяннікава ў галоўнай ролі, які б, несумненна, сваёй ігрой не проста ўпрыгожыў карціну, але і паспрыяў бы папулярнасці мастацкага твора, па якім яна знята. Але каб на адным з тэлеканалаў усімі любімы Генадзь Сцяпанавіч падзяліўся сваімі прыемнымі ўражаннямі пра яе — хвілін на пяць, не болей, глядзіш, кагосьці яна і вельмі зацікавіла б. Я чуў, як ён здорава чытае купалаўскага «Мужыка»: самому тут жа захацелася перачытаць «Жалейку» Купалы. Сёння Генадзь Аўсяннікаў расказаў бы, заўтра Аляксандр Саладуха любімы верш прачытаў бы. Ці гэта крок, як вы кажаце, з разраду фантазійных...

***— Ці не падаецца вам, што беларуская кніга, кніга, выдадзеная ў Мінску і іншых гарадах краіны, у большасці кнігарняў губляецца сярод выданняў многіх тысяч назваў, тых выданняў, што ў большасці сваёй прывезены з Расіі, найперш — Масквы?***

— Не так даўно адзін з нашых эстрадных спевакоў выказаў думку, што трэба неяк абмежаваць, хоць бы на час крызісу, колькасць выступленняў артыстаў з блізкага замежжа ў гарадах Беларусі, даўшы такім чынам магчымасць нашым зоркам і зорачкам больш гастраляваць. На што на форуме тут жа нехта скептычна заўважыў: добра, што хоць беларускія пісьменнікі не патрабуюць абмежаваць увоз у нашу краіну кніг замежных аўтараў.

Пытанне няпростае, хоць нішу, якую занялі Быкаў, Караткевіч, Танк, Стральцоў ды іншыя нашы пісьменнікі, уключаючы жывых, ніхто не заменіць. Мне здаецца, найбольш вострую канкурэнцыю даводзіцца вытрымліваць дзіцячай літаратуры. Заходзіш у кнігарню — якіх толькі дзіцячых кніг ні бачыш: і аб'ёмных, і з гукавымі дадаткамі. І часцей за ўсё гэта кнігі не беларускіх пісьменнікаў. Але вось нядаўна я спытаў у загадчыцы адной з нашых дзіцячых бібліятэк: якіх сёння дзіцячых кніг ім не хапае. На што пачуў адказ: вельмі не хапае кніг для сярэдняга школьнага ўзросту. Так што і ў гэтым кніжным акіяне можна не патануць, знайсці свайго чытача.

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО**

■ Экскурс у мінулае

# Легенды пасляваеннага Мінска

## Выварки грошай у ГУМе, архіерэйскае падвор'е на месцы Дома афіцэраў, вежачка Цанавы і цыркавыя звяры ў Свіслачы

**Пасля вызвалення сталіцы ў ліпені 1944-га Мінск было не пазнаць... Горад быў настолькі разбураны, што яго нават хацелі перанесці за 10 кіламетраў ад гістарычнага месца. Сталіцай Беларусі мог стаць і Магілёў. Хто ўсё ж такі вырашыў пакінуць Мінск на ранейшым месцы, як ішло будаўніцтва ключавых аб'ектаў сталіцы і якія ўнікальныя помнікі дойлідства былі страчаны ўжо ў мірны час — пра гэта і шмат што іншае, без чаго нельга ўявіць сучасны горад, расказаў краязнавец, аўтар даведніка «Мінск за адзін дзень» Хрыстафор ХІЛЬКЕВІЧ.**

### Дзе быць сталіцы, вырашыў Сталін

— Дакументальных сведчанняў таго, дзе хацелі будаваць новы Мінск, няма, — гаворыць краязнаўца. — Я падазраю, што канкрэтнага пункта і не было. Больш за тое, пачынаючы з 1942 года, у Маскве праходзілі выставы кшталту «Беларусь адбудаваная», «Праекты аднаўлення Мінска»... Яны ладзіліся нават у Трацця-коўскай галерэі! Вайна яшчэ была ў самым разгары, а архітэктары з усяго Савецкага Саюза ўжо працавалі над праектамі адбудовы Мінска. І нават нягледзячы на тое, што вельмі шматлікія разбурэнні Мінск спазнаў не ў 1941-м, а ў 1944-м, калі сталіцу вызвалялі савецкія войскі, архітэктары лічылі, што аднавіць сталіцу на старым месцы будзе рэальна. І, як пішуць у крыніцах, з невялікай перавагай галасоў было вырашана пакінуць Мінск на ранейшым месцы.

Ёсць увогуле легендарны момант у гісторыі пасляваеннага горада. У ліпені 1945 года Іосіф Сталін ехаў на Патсдамскую канферэнцыю і літаральна на 15-20 хвілін спыніўся на мінскім вакзале. Кіраўнік краіны выйшаў на перон, памахаў жыхарам і нават прайшоўся па пероне. Як кажуць летапісцы, з мінскага вакзала ў той час была відаць каланада Акадэміі навук — настолькі быў разбураны горад. І Панцеляймон Панамарэнка, які ехаў са Сталіным у адным вагоне да Брэста, спытаў Вярхоўнага галоўнакамандуючага, што ён пра гэта думае. «Разбурэнні ў Беларусі вялізныя, але тое, што я ўбачыў у Мінску, пераўзыходзіць усе магчымыя чаканні», — сказаў Сталін і падтрымаў думку, што сталіцу трэба аднаўляць на старым месцы.

Калі Іосіф Вісарыёнавіч у добрым настроі вяртаўся з Патсдамскай канферэнцыі, першы сакратар Кампартыі Беларусі асмеліўся папрасіць у яго грошай на некалькі шматкватэрных дамоў у цэнтры Мінска. «Ты, таварыш Панамарэнка, — кіраўнік рэспублікі, палітычная фігура буйнога маштабу, а так неглабальна думаеш», — сказаў Сталін і параіў таму папрасіць грошай на заводы. Неўзабаве ў сталіцы з'явіліся Мінскі аўтамабільны і Мінскі трактарны заводы.

### Дзецішча Лангбарда

Мала хто ведае, што Дом афіцэраў Іосіф Лангбард збудаваў на аснове Пакроўскай царквы архіерэйскага падвор'я. Левае крыло будынка і ёсць старая царква, толькі ўбудаваная ўнутр. Калі б у 1934 годзе Лангбард не перапрацаваў гэты праект, то, хутчэй за ўсё, там проста было б пустое месца. Так славуты архітэктар выратаваў будынак архіерэйскага падвор'я.

А оперны тэатр ён «пасадзіў» на самым высокім месцы Мінска — на Траецкай гары. Заняўшы вельмі выгадную пазіцыю, тэатр павінен быў быць яшчэ на некалькі дзясяткаў метраў вышэй. Праект быў шыкоўным! Зала мусіла ўмяшчаць 5 тысяч гледачоў. Але, як гэта часта бывае, у працэсе будаўніцтва грошы скончыліся, таму той тэатр, які задумаў маэстра, мы можам бачыць толькі ў эскізах. Кажуць, што калі б Лангбард ажыццявіў свой першапачатковы праект, то будынак тэатра можна было б бачыць з савецка-польскай мяжы, якая ў той час праходзіла ў раёне Заслаўя. Скульптур і барэльефаў, якія ўпрыгожваюць тэатр цяпер, у савецкі час не было. Некаторыя фрагменты з вонкавага аздаблення дадалі толькі падчас апошняй рэканструкцыі тэатра.

Іосіф Лангбард быў архітэктарам свайго часу, які вельмі шмат зрабіў для Мінска. Не меншай павагі заслугоўвае і Георгій Заборскі — аўтар Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, дамоў па вуліцы Леніна, плошчы Перамогі з самім помнікам і іншых помнікаў дойлідства.



**Дамініканскі касцёл XVII стагоддзя стаяў за сучасным Палацам Рэспублікі.**

### Прынцып Цанавы

Першым будынкам, які з'явіўся на сучасным праспекце Незалежнасці, быў будынак Камітэта дзяржаўнай бяспекі (тады Міністэрства дзяржаўнай бяспекі). Будавалі яго, як і оперны тэатр, ваеннапалонныя немцы. Аўтарам быў сам начальнік упраўлення архітэктуры Уладзімір Кароль.

— Ёсць такая легенда, якую апісаў у сваіх «Мінскіх гісторыйках» Міхаіл Валодзін, што вежачка на будынку з'явілася па распараджэнні Цанавы, — узгадвае краязнаўца. — Кароль выказаў сваю незадаволенасць: маўляў, парушыцца прынцып сіметрыі. Міністр дзяржаўнай бяспекі БССР Лаўрэнцій Цанава знайшоў, што яму адказаць: «Можа, у архітэктуры ты і кароль, але ў Беларусі кароль я. Таму ніякіх прынцыпаў сіметрыі, тут працуе прынцып Цанавы». Другая легенда гаворыць пра тое, што Цанава быў заўзятарам футбола і менавіта з гэтай вежы ён нібыта назіраў за футбольнымі матчамі, якія адбываліся на стадыёне «Дынама».

Тым не менш вежа так і засталася недабудаванай. Над ёй меўся быць вялікі шпіль, падобны да таго, які мы маем на вуліцы Камуністычнай. Але Мінску са шпілямі не шанцавала...

Амаль адначасова з будынкам МДБ узводзіўся і штаб Беларускай ваеннай акругі, які будавалі на базе даваеннага медыцынскага факультэта БДУ. Да рэвалюцыі на гэтым месцы ўвогуле стаяў Уздзвіжанскі манастыр і жаночае духоўнае вучылішча.

Цікава, што першапачаткова сучаснае Міністэрства абароны было пабудавана ў выглядзе літары «Ш». Праект прымусілі перарабіць: маўляў, калі вораг будзе ляцець на самалёце, то ўбачыць «Ш» — значыць «штаб». Архітэктара выратаваў маршал Цімашэнка. Тагачасны кіраўнік Беларускай ваеннай акругі сказаў: «Гэта калі ён будзе ляцець з Масквы, а калі ж з боку Берліна, то ўбачыць літару «Т» — значыць «тэатр». Тым не менш будынак быў рэканструяваны.



**«Вароты горада» на Прывакзальнай плошчы.**

### У ГУМ — як у музей

Першым пасля вайны грамадскім палацам стаў ГУМ. Людзі прыходзілі сюды, як у музей — часта нават не па пакупкі, а каб палюбавацца ўнутраным аздабленнем. Магазін быў вельмі дорага абсталяваны. Кожны паверх, напрыклад, быў аздоблены пэўным сортам драўніны. Кажуць, што ў першы дзень, калі адкрылася крама, чэргі былі такімі, што людзі не ўмяшчаліся ў будынак і стаялі на вуліцы. А грошай прыносілі столькі, што тыя не лезлі ў касы, таму пад касамі ставілі выварkі, якія потым непрыкметна выносілі.

Унікальны і праект Галоўпаштамта. Доўгі час спрачаліся, хто аўтар будынка — ці той самы архітэктар Кароль, ці яго памочнік Духан. Але хто б ім ні быў, высветлілася, што галоўны фасад Галоўпаштамта — адзін у адзін фасад Палаца Полі, пабудаванага яшчэ ў эпоху Адраджэння ў Рыме.

### Трафейны гадзіннік і першыя кватэры

Першы мікрараён у Мінску з'явіўся ў канцы 1940-х гадоў. Гэта дамы на Прывакзальнай плошчы, у тым ліку так званыя «Вароты горада». Аўтар — Барыс Рубаненка.

— Вароты горада стылізаваліся пад старажытны Мінск, — расказвае Хрыстафор Хількевіч. — А ўпрыгожвае іх самы вялікі гадзіннік (3,5 метра ў дыяметры!) у Беларусі. Кажуць, што ў сталіцу ён быў прывезены з Кёнігсберга ў якасці трафея і яму ўжо больш чым 100 гадоў!

Жыллё для генералітэта будавалі ў Асмалоўцы. У першыя пасляваенныя гады квартал замыкаўся, каб ніхто з чужых не мог трапіць унутр. Для простых людзей дамы ўзводзіліся ў пасёлку трактаразаводцаў і ў іншых месцах горада. На сучасным праспекце Незалежнасці атрымлівалі кватэры тыя, хто займаў ключавыя пасады ў краіне.

### Марскія львы ў Свіслачы

Цікавую гісторыю мае будынак цырка. Той цырк, які мы ведаем, узнік у другой палове 1950-х гадоў. Але ж і да вайны быў цырк драўляны, які знаходзіўся ў парку Горкага — якраз на месцы помніка класіку. Па ўспамінах людзей, калі пачалі бамбіць Мінск, эвакуяваць жывёл не атрымалася. Пашкадаваўшы сваіх падапечных, супрацоўнікі цырка выпусцілі марскіх львоў і коцікаў у Свіслач. Потым іх бачылі ў Бярэзіне і нават у Дняпры.

Амаль такі ж самы цырк, які згарэў на пачатку вайны, жыхары горада Арла падарылі Мінску пасля вызвалення. Цырк быў невялікі, таму вырашылі будаваць яго на новым месцы. Меркавалася, што з'явіцца ён у раёне трактарнага завода — па тым часе на ўскрайку горада. Артысты не маглі такога дапусціць. Вырашыла сітуацыю прыма Беларускага тэатра оперы і балета Ларыса Александроўская. Яна і ўгаварыла тагачаснага першага сакратара Кампартыі Беларусі Патолічава, з якім была ў добрых адносінах, будаваць цырк у цэнтры горада — менавіта там, дзе ён сёння стаіць.

### Страчаны храм

Тагачасныя архітэктары не лічылі Верхні горад гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Шмат у якіх праектах заставаўся праваслаўны Свята-Духаў кафедральны сабор, але ўвесь старажытны цэнтр — касцёл Святога Іосіфа, гандлёвыя рады, дом масонаў і сядзіба Ваньковічаў — былі выкраслены з гісторыі горада. Нават Хрушчоў, калі прыехаў у сталіцу, сказаў: «Я не ведаю старога Мінска. Яго, напэўна, і не было». Той жа Лангбард прапаноўваў знесці амаль увесь Верхні горад і пракласці магістраль ад будынка ЦК Кампартыі да опернага тэатра. Прапанову не ўхвалілі.

Самым вялікім храмам Мінска пасля вайны лічыўся дамініканскі касцёл, які стаяў за сучасным Палацам Рэспублікі. «У канцы XVIII стагоддзя амаль увесь Мінск быў каталіцкім, — удакладняе Хрыстафор Хількевіч. — Дамініканскі кляштар быў узведзены яшчэ ў 1610-х гадах. І гэта быў не проста манастыр, гэта была крэпасць на падыходзе да Мінска з усходняга боку. У 1986 годзе, калі будавалі Палац Рэспублікі, то знайшлі шмат чалавечых астанкаў. Як высветлілася, належалі яны манахам, якія ў XVII — XVIII стагоддзях абаранялі горад. Цяпер падмуркі касцёла ў цудоўным стане. Яго можна аднавіць гэтак жа, як аднавілі Свята-Духаву царкву ў Верхнім горадзе».

У 1926 годзе Дамініканскі касцёл трапіў у спіс усяго толькі 10 мінскіх помнікаў культуры і беларускай спадчыны. У вайну ў будынак трапіла бомба. Пашкоджанні былі нязначнымі, але ў 1945 — 1946 гадах з немцаў нават узялі кантрыбуцыю за тое, што яны пашкодзілі помнік рэспубліканскага значэння. А ўсяго праз пяць гадоў гэты ўнікальны храм самі ж і ўзарвалі: на Кастрычніцкай плошчы будавалі помнік Іосіфу Сталіну. Манумент правадыру прастаяў усяго 9 гадоў, манастыр жа — 3,5 стагоддзя.

Падобны лёс чакаў многія мінскія храмы. І самае крыўднае, што гэта была не віна вайны, а «заслуга» мірнага часу.

* * *

Праз тры месяцы пасля вызвалення Мінска — у кастрычніку 1944 года — газета «Звязда» напісала, што толькі цяпер вуліцы пазбаўлены ад мін. Неўзабаве пачалі з'яўляцца публікацыі пра аднаўленне ключавых будынкаў сталіцы — у тым ліку пра тыя, пра якія мы расказалі. Горад вырастаў наноў. Журналісты ж «будавалі» яго на старонках найстарэйшай газеты краіны.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*
**Фота з архіва Хрыстафора ХІЛЬКЕВІЧА**


РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
**«Открой Мир привилегий!»**

**Сведения об организаторе:**
Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.
**Наименование Рекламной игры:**
Рекламная игра носит название «Открой Мир привилегий!».
**Сроки проведения Рекламной игры:**
Рекламная игра проводится с 8 февраля 2016 года по 3 мая 2016 года (включая период розыгрышей и вручения призов).
**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:**
Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 2700 от 28 января 2016 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.
**Количество участников Рекламной игры:**
Всего к участию в игре было допущено 2 537 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.
**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд разыгран полностью.

| Победители по результатам первого розыгрыша от 24 февраля 2016 года | Выигрыш |
|---|---|
| 175 победителей | Пригласительный билет на две персоны на показ фильма «Бэтмен против Супермена: На заре справедливости» в кинотеатре SilverScreen ARENAcity в 18:40, 24 марта 2016 г. |

| Победители по результатам второго розыгрыша от 10 марта 2016 года | Выигрыш |
|---|---|
| 175 победителей | Пригласительный билет на две персоны на показ фильма «Бэтмен против Супермена: На заре справедливости» в кинотеатре SilverScreen ARENAcity в 18:40, 24 марта 2016 г. |

Победители по результатам третьего розыгрыша от 11 апреля 2016 года:

| № | Фамилия | Имя, отчество | Выигрыш |
|---|---|---|---|
| 1 | Последний | Дмитрий Александрович | Подарочный сертификат на услуги компании ООО «Первая туристическая компания» на сумму 100 000 000 белорусских рублей и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 14 942 529 белорусских рублей |
| 2 | Фролова | Олеся Михайловна | Подарочный сертификат на услуги компании ООО «Первая туристическая компания» на сумму 100 000 000 белорусских рублей и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 14 942 529 белорусских рублей |
| 3 | Ярмолик | Виталий Владимирович | Подарочный сертификат на услуги компании ООО «Первая туристическая компания» на сумму 100 000 000 белорусских рублей и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 14 942 529 белорусских рублей |

**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры и сведения о результатах проведения рекламной игры:**
Публикация правил рекламной игры – газета «Звязда», № 19 (28129), дата 02.02.2016 г.
Публикация сведений о результатах проведения рекламной игры – № 83 (28193), 4 мая 2016 г.
Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: + 375 29 6 308 038.
Полную информацию о победителях смотрите на сайте: **www.360.by**



**Извещение о проведении повторного конкурса по продаже имущества ОАО «Гроднооптторг»**
Предмет конкурса № 1, в состав которого входят:

| | |
|---|---|
| Административное здание (560,9 кв.м), инвентарный номер 400/С-5762 , проходная (8 кв.м), инвентарный номер 400/С-70806, (здание административное с проходной) (12) | Котел водогрейный «Кадам» 28 кВт (1997 г.) |
| Склад № 1(828,1 кв.м), инвентарный номер 400/С-57641(13) | Котел КЧГ-8-98 «Полымя» (2012 г.) |
| Склад (склад № 2,3) (3 659 кв.м), инвентарный номер 400/С-36959 (14) | Кран козловой КК20-32 (1988 г.) |
| Арочный склад (здание арочного склада) (464,4 кв.м), инвентарный номер 400/С-70764 (17) | Кран козловой КК20-32 (1988 г.) |
| Проходная (14,5 кв.м), инвентарный номер 400/С-70794 (16) | Кран-балка Т3 (1988 г.) |
| Гаражи (гараж на 10 а/м) (567,3 кв.м), инвентарный номер 400/С-36956 (18) | Кран-штабелер (1980 г.) |
| Зарядная (301,5 кв.м), инвентарный номер 400/С-36958 (19) | Мини АТС «Panasonik-TEM824RU» (2007 г.) |
| Склад олифы (95 кв.м), инвентарный номер 400/С-70774 (24) | Охранно-пожарная сигнализация в административном здании (2008 г.) |
| Сторожевая будка (14,2 кв.м), инвентарный номер 400/С-70797 (23) | Шкаф ШР-5 1600*500*300 (2008 г.) |
| Сторожевая будка (10,5 кв.м), инвентарный номер 400/С-70777 (22) | Шкаф ШР-8 1700*800*450 (2008 г.) |
| Склад открытого хранения (1972 г.) | Электронагреватель (2007 г.) |
| Склад-навес (склад – навес из металла) (170,9 кв.м), инвентарный номер 400/С-70760 (126) | Система устройства связи административного помещения (2008 г.) |
| Склад-навес (склад – навес из металла) (103 кв.м), инвентарный номер 400/С-70762 (25) | Весы автомобильные АП-10 (РП-10Ш) (2006 г.) |
| Склад-навес (навес для автомобилей) (465,7 кв.м), инвентарный номер 400/С-70763 (127) | Весы автомобильные РП-15Ш (2006 г.) |
| Наружный водопровод (1961 г.) | Компрессор К-1 (1999 г.) |
| Ограждение территории (1990 г.) | Наружная канализация (1961 г.) |
| Пожарный резервуар №1(1961 г.) | Электросети (1979 г.) |
| Пожарный резервуар № 2 (1979 г.) | Площадка №1 (1980 г.) |
| Комплект трансформаторной подстанции (1979 г.) | Площадки открытого хранения (площадки №№ 2,3,4) (1980 г.) |
| Котел водогрейный «Кадам» 61 кВт (1997 г.) | Подъездные пути (1980 г.) |
| | Сверлильный станок (1981 г.) |
| | Емкость металлическая (1988 г.) |
| | Емкость металлическая (1988 г.) |
| | Емкость металлическая (1988 г.) |
| | Емкость металлическая (1988 г.) |
| | Насос UPS 40-120 F 1*230V (2006 г.) |
| | Автоцистерна (1986 г.) |
| | Автоцистерна (1986 г.) |
| | Автомобиль ГАЗ САЗ 3507 (1993 г.) |
| | Трактор МТЗ-82 (1991 г.) |
| | Погрузчик с бортовым поворотом Амкодор 208В (2006 г.) |
| | Автопогрузчик ДВ 1792 (1989 г.) |
| | Торговый киоск (2010 г.) |
| | Оргтехника, офисная мебель, неустановленное оборудование и иное имущество. |

**Место нахождения предмета конкурса: г. Гродно, ул. Сокольская, 62.**
Земельный участок с кадастровым номером 440100000001000790, площадь – 3,6347 га, назначение – эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений базы.
**Начальная цена предмета конкурса 12 843 536 536 бел. рублей с НДС.**
**Сумма задатка – 500.000.000 бел. рублей.**
При проведении конкурса участники обязаны при регистрации сдать запечатанные конверты с предложениями по цене предмета конкурса и выполнению условий конкурса.
**Продавец имущества – ОАО «Гроднооптторг»**
**(230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62, управляющий (029) 6822962).**
**Организатор конкурса – СООО «Глобал Тауэр»**
**(220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 131-7, тел. (033) 9028379).**

**Условия конкурса по продаже имущества ОАО «Гроднооптторг».**
Предоставление в безвозмездное пользование:
- помещений административного здания: приемная №1, кабинет руководителя №1а, кабинета юрисконсульта и экономиста № 2, кабинет главного бухгалтера № 3, кабинет главного инженера № 6, кабинет бухгалтерии № 8, архив № 17, серверная № 16 и имущества, находящегося в них;
- складского помещения №1 площадью 83,2 кв.м в складе №1;
- здания зарядной площадью 301,5 кв.м, с инвентарным номером 400/С-36958;
- склада-навеса площадью 465,7 кв.м, с инвентарным номером капитального строения 400/С-70763 для обеспечения деятельности ОАО «Гроднооптторг», связанных с проведением процедуры банкротства до окончания ликвидационного производства.
*Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в конкурсе по предмету конкурса, на который регистрируется заявитель, на р/с № 3012127410010 Региональная Дирекция № 400 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Гродно, БИК 369, получатель – ОАО «Гроднооптторг», УНП 500013881.*
К участию в конкурсе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором конкурса о правах и обязанностях сторон при проведении конкурса, внесшие задаток и предоставившие организатору конкурса заявление на участие в конкурсе с приложением следующих документов:
заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении конкурса;
для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.
При подаче документов на участие в конкурсе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Прием заявлений на участие в конкурсе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором конкурса день и время, указанные в извещении о проведении конкурса. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в конкурсе.
Победителем конкурса признается участник, предложивший, по мнению комиссии, лучшие условия. Цена продажи фиксируется в протоколе о результатах конкурса и включает в себя НДС. Победитель конкурса (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета конкурса в течение 10 рабочих дней со дня проведения конкурса. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем конкурса (покупателем) не позднее 30 дней со дня проведения конкурса, если иной срок не установлен комитетом кредиторов. В случае признания конкурса несостоявшимся в связи с тем, что на участие в конкурсе подано заявление только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, при его согласии предмет конкурса продается единственному участнику, на предложенных им условиях при соответствии его предложений условиям конкурса.
Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение конкурса осуществляется победителем конкурса (покупателем) помимо оплаты стоимости предмета конкурса в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения конкурса.
Организатор конкурса имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с конкурса предмет торгов и отказаться от его проведения.
Публикации извещений о проведении конкурсов по продаже имущества ОАО «Гроднооптторг»: первый конкурс 02 февраля 2015 г. газета «Звязда» от 30.12.2014 г. № 247, первый повторный конкурс 25.03.2015 г. газета «Звязда» от 10.03.2015 г. № 45, второй повторный конкурс 14.05.2015 г. газета «Звязда» от 24.04.2015 г. № 77, третий повторный конкурс 29.05.2015 г. газета «Звязда» от 15.05.2015 г. № 90, четвертый повторный конкурс 16.11.2015 г. газета «Звязда» от 30.10.2015 г. № 210, пятый повторный конкурс 23.12.2015 г. газета «Звязда» от 08.12.2015 г. № 237, шестой повторный конкурс 11.02.2016 г. газета «Звязда» от 27.01.2016 г. № 15.
Конкурс проводится **19 мая 2016 года в 13.00** по адресу: 230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62. Заявления и документы подаются в рабочие дни **с 16 мая по 18 мая 2016 года включительно** с 11.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Срок окончания подачи заявок – **18 мая 2016 г**.
**Телефон для организации осмотра предмет конкурса: (044) 566 00 51.**
**Телефон для консультаций и справок: (033) 902 83 79.**
**Сайт в интернете: www.opttorg.grodno.by**

Краіна здароўя

Выпуск № 6 (359)

■ Круглы стол

# АТАКА НА МАРГАРЫН

## КАЛІ НА ПЕРШЫ ПЛАН ВЫХОДЗІЦЬ ЯКАСЦЬ...

**КАРЦІНКА з жыцця: малое надрываецца ў магазіне каля чыпсаў: «Купі-і-і...!», і мама закідвае ў цялежку некалькі ўпаковак, але дзіця не супакойваецца: «Дай зараз!» Жанчына спакойна кажа: «Спачатку ты павячэраеш, а на дэсерт атрымаеш...» Тут не ў саміх чыпсах справа — таксама прадукт. А вось «харчовая палітыка» ў сям'і скандаліста — мякка кажучы, вымушае жадаць лепшага. Словам, працягнем тэму таго, як і што есці. Будзем разбірацца з дапамогай намесніка генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні НАН Беларусі Алены МАРГУНОВАЙ, начальніка Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па бяспецы і якасці прадуктаў харчавання Ірыны ПАЧЫЦКАЙ і вядучага навуковага супрацоўніка Навукова-практычнага цэнтра гігіены, кандыдата медыцынскіх навук, дацэнта Васіля ЦЫГАНКОВА.**


Алена МАРГУНОВА.



Ірына ПАЧЫЦКАЯ.



Васіль ЦЫГАНКОЎ.

### ЗАГАДКА ЭТЫКЕТКІ

***— Калі казаць пра харчовую прадукцыю, прадстаўленую ў айчыннай гандлёвай сетцы, — хто і што робіць яе бяспечнай для спажыўца?***

**Алена МАРГУНОВА:** — Сёння мы дабіліся поўнай бяспекі прадуктаў, і на першы план выходзіць якасць, а гэта — адладжаны кантроль на ўсім тэхналагічным ланцугу вытворчасці. Каб дабіцца экалагічна бяспечнай прадукцыі для дзяцей, вучоныя распрацавалі цягам пяці гадоў каля 350 яе найменняў. Дзіцячая прадукцыя збалансаваная па колькасці неабходных вітамінаў, мікранутрыентаў, спрыяе ўмацаванню імуннай сістэмы, росту і развіццю. Распрацоўваецца функцыянальнае, прафілактычнае і аздараўленчае харчаванне для дарослых. За пяць гадоў з'явілася 295 найменняў малочнай прадукцыі, звыш 100 найменняў мясных вырабаў, 1100 — плодаагароднінная прадукцыі, 124 — масла-тлушчавай, каля 1000 — кандытарскіх вырабаў. Усё гэта адносіцца да катэгорыі экалагічна бяспечных прадуктаў, з нізкай колькасцю солі, цукру, трансізамераў тлустых кіслот і харчовых дабавак штучнага паходжання, без ГМА. Тут улічаны ўсе еўрапейскія нормы і патрабаванні. Распрацаваная на базе цэнтра Канцэпцыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне здаровага харчавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гады прадугледжвае забеспячэнне розных груп насельніцтва здаровым харчаваннем з улікам традыцый і эканамічнага складніка. Падрыхтаваны ў межах дакумента і праект Закона «Аб дзіцячым харчаванні», асаблівая ўвага ў якім удзяляецца стварэнню ўзбагачаных прафілактычных прадуктаў і арганізацыі сацыяльнай рэкламы здаровага харчавання.

**Ірына ПАЧЫЦКАЯ:** — Наша ўстанова адсочвае паказчыкі якасці і бяспекі харчовай сыравіны і прадуктаў, як айчынных, так і завезеных. Праводзяцца выпрабаванні практычна ўсіх груп харчавання (мясной, малочнай, кандытарскай, вінаробнай і г.д) па шэрагу паказчыкаў: арганалептычныя, фізіка-хімічныя, мікрабіялагічныя, на таксічныя элементы, пестыцыды, мікатаксіны, на наяўнасць ГМА, радыенукліды (цэзій, стронцый). Сёлета праверана вялікая колькасць прадуктаў харчавання, у тым ліку дзіцячых, і дзесьці толькі 2 працэнты не адпавядала нормам — галоўным чынам, па харчовай каштоўнасці, мікранутрыентах.

**«Можаце браць малако любой тлустасці, але сачыце за колькасцю, улічвайце, што гэта харчовы прадукт, а не вада! Шклянка малака — гэта прыём ежы, а не наталенне смагі!»**

***— Ці трапляецца на нашым рынку фальсіфікаваная прадукцыя?***

**Ірына ПАЧЫЦКАЯ:** — Мы праводзілі маніторынг прадуктаў харчавання, прадстаўленых на нашым рынку, — імпартных і айчынных, і ў першую чаргу дзіцячых. Па паказчыках бяспекі ўсё адпавядала норме, праблема была з неадпаведнасцю маркіровак. Так, на этыкетцы магла быць заяўлена адна колькасць вітаміну С і мікраэлементаў, а ў наяўнасці столькі не было. Неадпаведнасць выяўлялася амаль у палове як айчыннай, так і замежнай прадукцыі. А гэта — недастатковае інфармаванне спажыўца. На этыкетцы павінна быць напісана тое, што ўваходзіць у склад. З іншага боку, ні ў адным нарматыўным дакуменце такая адпаведнасць не нарміруецца.

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Так адбываецца не таму, што вытворцы спецыяльна не дакладваюць вітаміны ці мікраэлементы. Трэба разумець, што для разлікаў выкарыстоўваюцца табліцы састарэлыя, яшчэ савецкіх часоў. У моркве, сабранай шмат гадоў таму, сапраўды было больш бэта-караціну. Акрамя таго, колькасць таго ж вітаміну вытворца вызначае не ў канчатковым прадукце, а па ўкладанні. Праблема — у недасканаласці метадаў кантролю вытворчых лабараторый.

**Алена МАРГУНОВА:** — На жаль, пакуль не створаны новыя нацыянальныя табліцы. Каб удакладніць звесткі па ўсіх фізіка-хімічных паказчыках для жывёльнай і расліннай сыравіны, трэба правесці велізарную работу. Наш цэнтр спрабуе заняцца гэтым пытаннем, таму аднойчы мы атрымаем новы сістэмны падыход.



### КОЛЬКІ МЯСА Ў КАЎБАСЕ?

***— Здаецца, з бяспекай у нас справы лепш, чым з якасцю...***

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Прызнацца, у мяне ёсць асабістыя пытанні да рынку нашых харчовых тавараў. Мы бачым, што прылаўкі запоўненыя, але чым менавіта яны запоўненыя? Абсалютная большасць каўбас, якія мы бачым у любой краме, будзе змяшчаць глутамат натрыю. Гэта не страшнае рэчыва, і, тым не менш, я лічу, што каўбаса павінна складацца з мяса, шпіку, солі, спецый, але мы ўбачым на этыкетцы вялікую колькасць харчовых дабавак. Яны бяспечныя, але сам факт — навошта спажыўцу столькі дабавак у адным прадукце? А калі яны там ёсць, то і не варта называць гэта каўбасой. Можа быць, каўбасным прадуктам?.. Калі ўзяць хлебабулачныя вырабы, то цвіль на іх з'яўляецца яшчэ да таго, як скончыўся тэрмін прыдатнасці. Батон сыплецца як парашок, а паглядзіш на этыкетку — там і фасфаты, і трыгліцэрыды... А хлеб — гэта ж мука, вада, соль і дрожджы! Хто жыў у савецкія часы, той памятае батоны за 13 і 15 капеек — іх было два віды, але ж гэта была якасць! Не буду агульна крытыкаваць усю нашу хлебабулачную прадукцыю, ёсць дастатковая колькасць выдатных вырабаў, але пытанне якасці застаецца актуальным. Варта сказаць і пра маргарын — тыповы транстлушч, які павышае рызыку развіцця атэрасклерозу, а ў нас амаль уся кандытарская прадукцыя і паўфабрыкаты зроблены менавіта на гэтым тлушчы. У ЗША ў 2018 годзе маргарын наогул не будзе выкарыстоўвацца ў кандытарскай і хлебапякарнай прамысловасці. Там ідуць да гэтага з мінулага года.

**Алена МАРГУНОВА:** — Будуць замяняць на пальмавы алей...

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Магчыма. Усё ж такі гэта натуральны прадукт. Іншая рэч, у нас пакуль няма методык, каб адрозніць тэхнічны пальмавы алей ад харчовага... Але замяняць маргарын неабходна, і такой заменай можа быць любы экзатычны для нас алей, калі будзе пацверджана яго бясшкоднасць. У мінулым стагоддзі маргарын прадаставіў выдатную магчымасць накарміць людзей. Але пытанне насычэння рынку — гэта ўчарашні дзень. Вытворцаў трэба арыентаваць на тое, каб прадукт быў больш карысным. Іначай мы пасля значна даражэй заплацім за лячэнне спажыўцоў няякасных прадуктаў... Кантроль у нас дастатковы, і празмерным яго рабіць не трэба, а вось нашы вытворцы павінны заняць больш актыўную пазіцыю ў выпуску новых і сапраўды карысных харчовых прадуктаў.

**Алена МАРГУНОВА:** — Сёння якасць прадукцыі не прапісана ні ў адным дакуменце. Размова ідзе толькі пра бяспеку, і да яе прад'яўляюцца патрабаванні, а якасць — гэта канкурэнтаздольнасць вытворцаў. Тым не менш нашы новыя рэцэптуры прадугледжваюць, як я ўжо гаварыла, змяншэнне солі, цукру, транстлушчаў. І гэтыя новыя рэцэптуры паступова ўкараняюцца. Наша задача — прапанаваць вытворцам, а вырашаць ім.

### ЛЕПШ НЕДАСАЛІЦЬ

***— Адным словам, чытайце этыкеткі і рабіце правільны выбар...***

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Менавіта так, хоць і з маркіроўкай ёсць праблема. У шэрагу выпадкаў штосьці ўбачыць можна толькі з лупай. А паводле стандарту, я павінен прачытаць этыкетку без напружання.

**Алена МАРГУНОВА:** — Тут дзейнічае рэгламент па маркіроўцы, агульны для краін ЕАЭС. Цяпер адзін з бакоў прапануе змяненні — каб можна было прачытаць на адлегласці 25-30 см ад вачэй. Але гэта нерэальна...

**«Маргарын — тыповы транстлушч, які павышае рызыку развіцця атэрасклерозу, а ў нас амаль уся кандытарская прадукцыя і паўфабрыкаты зроблены менавіта на гэтым тлушчы».**

***— Маркіраваць вялікімі літарамі, каб можна было пачытаць, 13 або 15 там дабавак?***

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Усё ж такі адназначна шкодных прадуктаў у нас няма. Існуе толькі адзін небяспечны прадукт, абсалютная атрута для печані — гарэлка... Самае важнае, каб у нашым рацыёне былі разнастайныя харчовыя прадукты. Нічога добрага не будзе ў тым, калі вы будзеце есці толькі чорную ікру. Трэба мець на ўвазе, што морква з Лагойскага раёна змяшчае адну колькасць бэта-караціну, а з Віцебшчыны — іншую. Калі мы чагосьці не дабяром у адным прадукце, то возьмем з іншага. Таму ешце ўсё, а самае важнае — гародніну і садавіну, 500 г у дзень.

***— Разнастайнасць не выратуе ад лішку цукру і солі, якія ёсць амаль у любым прадукце...***

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Вытворца — самастойная юрыдычная асоба, якой ніхто не мае права дыктаваць, колькі солі класці. Наогул, тэхналогіі патрабуюць выкарыстання і солі, і цукру. Немагчыма вырабіць каўбасу без солі, а кісель без цукру.

**Ірына ПАЧЫЦКАЯ:** — Так, цукар і соль схаваныя фактычна ва ўсіх гатовых прадуктах. Але можна павярнуць пытанне іншым чынам. Акцэнт трэба рабіць не на каўбасе, у якую вытворца ўсё роўна будзе штосьці дадаваць, а на тым, каб купіць мяса і адварыць яго самому хоць бы і наогул без солі.

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Соль і цукар кожны чалавек павінен абмяжоўваць сам. Не дасольвайце самі хатнюю ежу. Норма солі для дарослага — не больш за 5 г у суткі. Калі чалавек гэтага не разумее, то нават калі мы выпусцім усе прадукты без солі, ён усё роўна будзе дасольваць. Дарэчы, людзі дзеляцца на генетычна адчувальных і не адчувальных да солі. У межах эксперыментаў выяўлялі тых, хто ў месцах грамадскага харчавання дасольваў стравы, абследавалі іх і высветлілі, што ва ўсіх — нізкая салявая адчувальнасць і... павышаны артэрыяльны ціск!

### ЗВЯРТАЙЦЕ ЎВАГУ НА КАЛАРЫЙНАСЦЬ

***— Даволі шмат момантаў, на якія трэба звяртаць увагу ў харчовай краме...***

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:**— Звяртайце ўвагу найперш на каларыйнасць прадукту. Ва ўсім свеце атлусценне стала эпідэміяй, і з гэтым звязаны многія іншыя захворванні. Мы мала рухаемся, а ежу спажываем такой каларыйнасці, што хапіла б селяніну, занятаму цяжкай фізічнай працай. Другі важны момант для спажыўца — колькі ў прадукце солі і цукру, трэці — каб ён змяшчаў хоць якія вітаміны і хоць у якой колькасці. Асабіста я ніколі не бяру прадукты на маргарыне, не бяру і ўсё вэнджанае, а што да каўбас, то гатую іх сам, праўда, не вельмі часта. Прыгадайце, што елі ў нас нядаўна на вёсцы — яйкі, малако, тварог, масла... Дарэчы, амерыканскія даследчыкі нарэшце вярнулі давер да масла. Дзецям болей, сталым меней, але у рацыёне яно быць павінна. Наогул, не рэкамендуецца ўвесь час ужываць абястлушчаныя малочныя прадукты. Можаце браць малако любой тлустасці, але сачыце за колькасцю, улічвайце, што гэта харчовы прадукт, а не вада! Шклянка малака — гэта прыём ежы, а не наталенне смагі!

**Ірына ПАЧЫЦКАЯ:** — Прадукцыя без дабавак, выпушчаная адпаведна ДАСТу, ёсць у нашай краіне. Але гэта невялікія партыі, такая прадукцыя мае малыя тэрміны прыдатнасці, дорага каштуе, мала запатрабаваная. На жаль, у большасці сваёй беларусы па-ранейшаму імкнуцца набываць тое, што танней, і ніякай увагі не звяртаюць ні на якія дабаўкі.

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Гандлю выгадна прадаваць тое, што мае больш тэрмін захоўвання. Дарэчы, яшчэ крыху — і нанатэхналогіі дазволяць выкарыстоўваць такую ўпакоўку, якая будзе забяспечваць і стэрыльнасць, і якасць, і г.д.

**Алена МАРГУНОВА:** — Працяглыя тэрміны захоўвання і сёння не трэба разглядаць як нейкае зло: сучасная ўпакоўка выдатна спраўляецца з такой задачай. Варта яшчэ дадаць, што ў нас цяпер нямала прадуктаў са знакам «Натуральны прадукт». Прысваеннем гэтага знака займаецца камісія па экспертызе пры Дзяржстандарце. Як член гэтай камісіі, магу засведчыць, што ў нас расце колькасць вытворцаў, якія падаюць дакументы на атрыманне знака. Асабліва для мясамалочнай прадукцыі, напояў, пітной і мінеральнай вады. «Натуральны прадукт» — гэта прадукт прэміум-класа. Дарэчы, прынятая ў нас і Канцэпцыя арганічнай вытворчасці. Спадзяёмся, хутка з'явіцца і такая прадукцыя.

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Для арганікі, праўда, трэба, каб гадоў семдзесяць зямля не эксплуатавалася. З арганічнага поля мы збяром вельмі мала. Арганічныя прадукты дарагія, а значыць, даступныя толькі забяспечаным людзям, а трэба імкнуцца, каб большасць папуляцыі атрымлівала доступ да нармальнай прадукцыі.

**Ірына ПАЧЫЦКАЯ:** — Па праўдзе, арганічная прадукцыя, вырашчаная без апрацоўкі, назапашвае з глебы менш карысных рэчываў. Там няма пестыцыдаў, але ёсць небяспека развіцця плесневых грыбоў і назапашвання мікатаксінаў.

**Васіль ЦЫГАНКОЎ:** — Калі гаварыць пра ГМА, то такая прадукцыя трапляе на прылавак у абсалютна малой колькасці. Пастаўшчыкі ведаюць, што ў нас самая нізкая дапушчальная норма па ГМА і што прадаць прадукт з такой маркіроўкай можна толькі па значна ніжэйшым кошце, што не выгадна.

■ Візіт да афтальмолага

# І ЗНОЎ УБАЧЫЦЬ СВЕТ

**Больш як у паловы беларусаў ва ўзросце пасля 60-ці ёсць катаракта — захворванне, звязанае з памутненнем хрусталіка вока, што абумоўлівае расстройства зроку рознай ступені, амаль да поўнай яго страты.**

— Для дыягностыкі патрабуецца вызначыць вастрыню зроку, поле зроку, памераць унутрывочны ціск, выконваюць таксама ўльтрагукавыя і электрафізіялагічныя даследаванні сятчаткі і зрокавага нерва, — тлумачыць **урач-афтальмолаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Галіна МІХНЕВІЧ**. — З дапамогай спецыяльнай лямпы вызначаецца ступень спеласці і памутнення хрусталіка. Можа спатрэбіцца і дадатковае абследаванне, якое выяўляе іншыя верагодныя парушэнні зроку — глаўкому або адслаенне сятчаткі.

У аднаго з дзесяці тысяч нованароджаных сустракаецца прыроджаная катаракта. І прычынай можа быць унутрывантробнае інфіцыраванне плода, ужыванне цяжарнай алкаголю, тытуню, наркотыкаў, некаторыя спадчынныя захворванні.

#### У набытай катаракты шмат сваіх прычын:

- ✓ узроставыя змяненні ў хрусталіку;
- ✓ неспрыяльнае ўздзеянне (высокія і нізкія тэмпературы, агрэсіўныя газы і вадкасці, таксіны, лекі, іанізуючае выпраменьванне, электрамагнітныя хвалі і г.д.);
- ✓ траўмы вачэй;
- ✓ захворванні (напрыклад, цукровы дыябет, артэрыяльная гіпертэнзія, рэўматоідны артрыт);
- ✓ працяглае ўжыванне гарманальных прэпаратаў:
- ✓ генетычная схільнасць.

Большую частку складаюць катаракты, звязаныя з узростам — старэчыя. Аднак у апошнія гады не толькі ў Мінску, але і па краіне назіраецца амаладжэнне гэтага захворвання. Насцярожыць павінна дваенне прадметаў, расплывістасць выявы, з'яўленне мурашоў, плямаў перад вачыма, жоўтае адценне выявы, цяжкасці падчас чытання (парушэнне кантрасту паміж літарамі і агульным фонам). Пачатковая стадыя можа цягнуцца ад 1-3 да 10-15 гадоў. Пры спелай катаракце зрок моцна пагаршаецца.

Прымяненне вочных кропель (кансерватыўны спосаб лячэння) можа папярэдзіць хуткае памутненне хрусталіка ў самым пачатку захворвання. Аднак адзіным эфектыўным метадам вылячэння застаецца хірургічнае ўмяшанне — выдаленне памутнелага хрусталіка і яго замена на штучную лінзу. Доўгі час практыкавалася выдаленне рэчыва хрусталіка, у той час як капсула хрусталіка заставалася непашкоджанай. Аднак у апошнія гады залатым стандартам лячэння стала выдаленне хрусталіка шляхам яго драблення ўльтрагукам (факаэмульсіфікацыя). Для такога ўмяшання не патрабуецца чакаць поўнага выспявання катаракты, яго можна выконваць у самым пачатку захворвання, у любым узросце.

Паказаннем для выдалення катаракты з'яўляецца зніжэнне вастрыні зроку, якое прыводзіць да абмежавання працаздольнасці, дыскамфорту ў звычайным жыцці, а не ступень яе выспявання.

Усе аперацыі выконваюцца ў дзяржаўных клініках высокакваліфікаванымі хірургамі, на сучасным абсталяванні. Пасляаперацыйныя ўскладненні ўзнікаюць вельмі рэдка і звычайна не ўяўляюць сур'ёзнай пагрозы. Нярэдка сляпы да выдалення катаракты чалавек адразу пасля хірургічнага ўмяшання пачынае зноў бачыць.

Каб адцягнуць час захворвання, запаволіць яго развіццё, неабходна весці здаровы лад жыцця: адмовіцца ад шкодных звычак, скінуць лішнюю вагу, ужываць дастатковую колькасць садавіны і гародніны, насіць сонцаахоўныя акуляры, вытрымліваць меры бяспекі на вытворчасці і ў быце.

■ Сучасны падыход

# НАВОШТА ДЗЯЎЧАТАМ ФАЛАТЫ?



## Усе жанчыны, якія плануюць цяжарнасць або здольныя зацяжараць, павінны штодня прымаць дабаўкі фоліевай кіслаты ў дозе 400-800 мкг

**Прыём дабавак фалатаў варта пачынаць за некалькі месяцаў да зачацця і працягваць першыя 2-3 месяцы цяжарнасці. Новым і эфектыўным падыходам, які забяспечвае жанчынам рэпрадуктыўнага ўзросту своечасовы прыём фалатаў да зачацця, з'яўляецца прыём аральных кантрацэптываў з метафалінам.**

Спецыялісты ўстанавілі, што амаль у 90 працэнтаў жанчын дзетароднага ўзросту колькасць фалатаў у эрытрацытах недастатковая. Пры гэтым жанчыны, як правіла, і не здагадваюцца аб неабходнасці прыёму гэтых вітамінаў. Дзве трэція жанчын, якія ўжо маюць дзяцей, прызнаваліся, што не кансультаваліся са спецыялістам перад цяжарнасцю. Даследаванні сцвярджаюць, што вялікая колькасць цяжарнасцяў — незапланаваныя, а значыць, і размовы аб ужыванні фалатаў ісці не магло.

Наогул фалаты — гэта жыццёва важныя вітаміны групы B. Іх рэгулярны прыём напярэдадні зачацця і ў першыя тыдні цяжарнасці на 70 працэнтаў зніжае рызыку з'яўлення дэфектаў нервовай трубкі плода, аднаго з самых распаўсюджаных прыроджаных парокаў развіцця. Таксама нармальны ўзровень фалатаў у крыві змяншае верагоднасць узнікнення ўскладненняў цяжарнасці (анеміі, павышанага ціску і ацёчнасці, невынашвання, заўчасных родаў, недастатковасці плацэнты і яе адслаення).

Фалаты ў арганізме не сінтэзуюцца. Крыніцай натуральных вітамінаў групы B з'яўляюцца зяленіва, печань, цытрусавыя, харчовыя дрожджы, яйкі, тварог, хлеб. Аднак нават калі ўжываць гэтыя прадукты рэгулярна і ў вялікай колькасці, узровень фалатаў у крыві ўсё роўна можа быць недастатковым — вітамін разбураецца пры цеплавой апрацоўцы або ў працэсе працяглага захоўвання таго ж зяленіва. Таму ўрачы і рэкамендуюць жанчынам рыхтавацца да зачацця — дадаткова прымаць фоліевую кіслату.

Аднак многія прапускаюць прыём вітамінаў — толькі кожная другая будучая маці (56 працэнтаў апытаных) прымае фоліевую кіслату пастаянна. Акрамя таго, назваць фоліевую кіслату раўнацэннай заменай натуральным фалатам нельга. Для таго, каб аказаць патрэбны эфект, вітамін павінен прайсці працэс ферментацыі ў страўнікава-кішачным тракце, а ў некаторых ён парушаны. Значна лепш успрымаецца арганізмам метафалін, які ўвайшоў у склад аральных кантрацэптываў новага пакалення. Метафалін для ажыццяўлення сваёй ролі не мае патрэбы ў пераўтварэннях, а пачынае дзейнічаць адразу. Так, кожная з 28 таблетак упакоўкі новага аральнага кантрацэптыву змяшчае 450 мкг метафаліну, што раўняецца 400 мкг фоліевай кіслаты, сутачнай дозе вітаміну.

— Штогод у краіне выяўляецца каля 2,5 тысячы парокаў развіцця плода, а некаторыя з гэтых выпадкаў можна было папярэдзіць, — кажа **загадчыца кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Людміла МАЖЭЙКА**. — Закладка пачатковых элементаў нервовай сістэмы дзіцяці адбываецца дзесьці на 25-ты дзень пасля зачацця, калі жанчына яшчэ нават не здагадваецца аб цяжарнасці. Да будучага зачацця, безумоўна, трэба рыхтавацца — ужываць фоліевую кіслату мінімум тры, а лепей 5-6 месяцаў...

«Кантрацэптыў з метафалінам не аказвае ніякага адмоўнага эфекту, наадварот, жанчына атрымлівае і паўнацэнную гарманальную кантрацэпцыю, і фоліевую кіслату, — дадае **вядучы навуковы супрацоўнік аддзялення гінекалагічнай эндакрыналогіі Навуковага цэнтра акушэрства, гінекалогіі і перынаталогіі імя У. І. Кулакова Міністэрства аховы здароўя Расійскай Федэрацыі, доктар медыцынскіх навук Святлана ЮРЭНЕВА**. — Як толькі жанчына вырашыць зацяжараць, яна будзе ўжо забяспечана дастатковым узроўнем вітаміну. Гэта будзе прафілактыкай узнікнення парокаў і шэрагу ўскладненняў. Нядаўнія замежныя даследаванні таксама паказалі, што сярод тых, хто ўжываў фалаты, у два разы радзей сустракаліся яшчэ і парокі сардэчна-сасудзістай сістэмы, а ў тых, хто не прымаў, часцей нараджаліся дзеці з эмацыянальнай няўстойлівасцю».

Спроба насычэння фалатамі прадуктаў харчавання ў некаторых краінах не спрацавала ў належнай ступені, таму што не ўсе жанчыны рэгулярна ўжывалі ўзбагачаную муку. Так і нарадзілася больш трапная стратэгія. Было вырашана звярнуць увагу на жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту, якія ў любы момант могуць прыпыніць кантрацэпцыю і спланаваць здаровую цяжарнасць.

— У біялагічнай ролі жанчыны нічога не змянілася — яна павінна нараджаць першае дзіця да 25 гадоў, карміць грудзямі цягам мінімум года, — дапаўняе Святлана Юрэнева. — Аднак у рэальным жыцці так не адбываецца. Узрост першых родаў пасунуўся бліжэй да 28 гадоў, а таму важна да гэтага ўзросту яшчэ захаваць сваё рэпрадуктыўнае здароўе.

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Подыум

# ЗАГАРНУЦЦА Ў РУЧНІК

## ЯК ПРЫДАЦЬ ПАЎСЯДЗЁННАМУ АДЗЕННЮ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАЛАРЫТ

**Нядаўна вядомая беларуская трыкатажная фабрыка запусціла новую лінію летняга адзення. З модных тэндэнцый выбралі вышыванку. Арнаментам упрыгожылі футболкі, сукенкі і шкарпэткі. Апошнія, па словах дызайнераў брэнда, пакупнікі асабліва ўпадабалі. Шкарпэткі імгненна разляцеліся, а фабрыка, убачыўшы ажыятаж, цяпер у спешцы дашывае дадатковыя пары.**

Вяртанне нацыянальных традыцый у паўсядзённае адзенне пакуль выглядае даволі павярхоўна. Чамусьці ўсе вытворцы ўчапіліся за арнамент і — хтосьці ўдала, хтосьці не вельмі — выпускаюць вышыванкі ў розных інтэрпрэтацыях. А публіка разбірае, бо попыт на нацыянальнае ёсць, а добрага дызайну — не так шмат. Спробай прапанаваць штосьці новае стаў мінскі фестываль-конкурс «Этна-стыль». Дызайнеры стварылі калекцыі, дзе прадставілі сваё бачанне, як можна спалучаць традыцыйнае і сучаснае.

Максімальна зручныя і цікавыя вобразы атрымаліся ў мадэльеркі Кацярыны Кабанавай. Сваю рамантычную калекцыю «Паэтка» яна адшыла з ільну, а для аздаблення выбрала шоўк. Фасоны простыя — свабодныя сукенкі даўжыні мідзі і максі, з поясам-бантам на таліі, і жакеты прамога крою. Знаходкай жа стаў колер. Дызайнерка афарбавала тканіну настоямі раслін і дрэў. Таму і колеры — бруднa-ружовы, глыбокі сіні, шэра-блакітны, цёплы салатавы (крытыкі сцвярджаюць, што менавіта гэта адценне зялёнага хутка будзе на піку папулярнасці і выцесніць смарагдавы) — атрымаліся прыроднымі ва ўсіх сэнсах. Аксесуарам стала шаўковая хустка. Прыгожа павязаная на галаве (нічога агульнага з тым, як яе носяць бабулі), яна глядзелася аўтэнтычна і модна адначасова. І, заўважце, у калекцыі, якая стала найлепшай у намінацыі «Майстар», ні на адной рэчы няма арнаменту. Відаць, надаць адзенню нацыянальны каларыт усё ж такі можна за кошт іншых сродкаў.

Прыродныя матывы, дарэчы, натхнілі не аднаго ўдзельніка фестывалю. Надзея Лунева прадставіла на подыуме адзенне, дзе асноўным узорам сталі галінкі і карані дрэў. На дзіцячых сарафанах і сукенках такія аплікацыі глядзеліся ярка і незвычайна. Традыцыйную бела-чырвоную гаму мадэльер разбавіла пастэльна-ружовым колерам. А завяршыла вобразы самаробнымі абадкамі са штучным лісцем.

Дызайнер Марына Гардзейчык для сваёй калекцыі выбрала залацісты і васільковы колеры. Цікавае рашэнне для адзення «на выхад». У залацістых паліто і сукенках па фігуры дакладна не застаняцеся незаўважанымі. Для тых, каму занадта ярка,



Стыльная «ручніковая» спадніца.

мадэльер прапанавала больш стрыманы, але не менш эфектны варыянт — камплект з доўгай сіняй спадніцай і кароткім пінжаком колеру спелага жыта.

Спробы абыграць арнамент таксама былі. Напрыклад, Дзіна Лавейкіна змясціла ўзоры на каўняры паліто і нашыўных кішэнях. Але пры гэтым прадумала і фасоны рэчаў, каб арнамент выглядаў дарэчным, а само адзенне не нагадвала эстрадны касцюм. На подыуме дызайнерка прадставіла сукенкі з махрамі на падоле, сарафаны максі з адкрытай спінай, камбінезоны, аздобленыя карункамі.

А вось мадэльеры Таццяна Кушнярова і Наталля Якутовіч, якія сталі пераможцамі ў намінацыі «Творчы пачын», за аснову сваёй калекцыі ўзялі ручнікі. У прамым сэнсе: з іх пашыты прадметы адзення. Атрымалася крыху футурыстычна, але некаторыя камплекты цалкам маглі б апынуцца ў гардэробе цяперашніх модніц. Напрыклад, кароткі расклёшаны топ з ручніка і шырокія штаны. Ці пышная спадніца-сонца па калена. Карацей, ёсць добрыя ідэі, якія мас-маркету, мне здаецца, варта ўзяць на заметку.

**Старшыня Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый СУРСКІ**, які ўзначальваў журы конкурсу, заўважыў, што яго ў першую чаргу цікавілі насільныя рэчы, якія можна тыражаваць і паспяхова прадаваць. З улікам гэтага і ацэньваліся калекцыі.

— Сёння вельмі шмат спекуляцый вакол арнаментыкі, — мяркуе Дзмітрый Сурскі. — Куды яе толькі ні ляпяць! Для мяне «вышымайкі» — асартымент сумніўнага характару. Тым не менш праз гэта таксама трэба прайсці. І добра, што гэта ёсць насамрэч, што людзей павярнулі да вытокаў, семантыкі нашых знакаў. Але ўсё ж такі прафесіяналізм ляжыць крыху вышэй. Трэба пераасэнсоўваць традыцыі больш глыбока, знаходзіць нейкія ўнікальныя матывы і правільна падаваць гэту мову, тэхналогію.

**Чамусьці ўсе вытворцы ўчапіліся за арнамент і выпускаюць вышыванкі ў розных інтэрпрэтацыях. А публіка разбірае, бо попыт на нацыянальнае ёсць, а добрага дызайну — не так шмат.**

Мне ўспамінаецца абарона дыпломаў у нашай акадэміі мастацтваў, на якую я трапіла некалькі гадоў таму. Адразу патлумачу: тыя, хто вучыцца на мадэльераў, не зачытваюць экзаменацыйнай камісіі тэарэтычныя работы. Замест гэтага яны паказваюць свае калекцыі. Тэму можна выбраць любую, але ў акадэміі вітаецца, калі студэнты спрабуюць інтэрпрэтаваць нацыянальны касцюм. Некаторыя бяруцца, але атрымліваецца не ва ўсіх. Бо, зноў жа, мысляць шаблонна. І дэманструюць на іспыце просценькія белыя сарафанчыкі. Але была калекцыя, якая сапраўды ўразіла. Адна з выпускніц абрала тэмай беларускае верхняе адзенне. Дзяўчат апранула ў свабодныя понча і грубыя даўгія паліто, хутчэй падобныя да мужчынскіх. Калекцыю студэнтка дапоўніла галаўнымі ўборамі накшталт тых,



Калекцыя «Паэтка».

што насілі некалі давідгарадчанкі. Капелюшы, бадай, занадта эксцэнтрычныя, каб сучасныя жанчыны маглі іх прымераць, а вось у падобных паліто модніцы цяпер ходзяць. Шкада толькі, што гэты трэнд яны пераnялі з Захаду: у нашых дызайнераў былі козыры, каб прапанаваць (ці вярнуць) яго першымі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота Нацыянальнай школы прыгажосці**



Дзіцячае адзенне з аплікацыяй галінак і каранёў дрэў.



«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ПАДКАРМІЦЕ ЧОРНУЮ ПАРЭЧКУ



***Напэўна, няма такога дачніка, які не пасадзіў бы на сваім участку хоць некалькі кустоў чорных парэчак. Аб карысці гэтых гаючых ягад ведаюць усе. Па колькасці вітамінаў, мінералаў і карысных рэчываў чорная парэчка перасягнула ўсе вядомыя чалавецтву ягады. А вось сама культура непатрабавальная і сціплая — ніякага спецыяльнага догляду не патрабуе. Нават калі наогул яе не даглядаць, шмат гадоў яна будзе сумленна даваць карысныя ягады.***

***Але ўсё-ткі праз 2 гады пасля з'яўлення на ўчастку кустоў чорнай парэчкі трэба абавязкова пачаць удзяляць ёй сваю гаспадарскую ўвагу.***

### ЧЫМ І КАЛІ?

Ранняй вясной лепш за ўсё падкарміць азотнымі ўгнаеннямі. Для маладых кустоў гэта будзе прыкладна 40-50 г мачавіны пад кожную расліну; потым, пачынаючы з 4-га года, колькасць мачавіны варта паменшыць да 25-40 г ды яшчэ і падзяліць на 2 падкормкі.

Увосень пад кожны куст пажадана ўнесці ад 4 да 6 кг арганікі (птушыны памёт, кампост, гной), ад 10 да 20 г сернакіслага калію і прыкладна па 50 г суперфасфату. Гэты набор лічыцца асноўным угнаеннем, бо ўключае ў сябе ўсе неабходныя кампаненты «парэчкавага харчавання».

Дасведчаныя садоўнікі рэкамендуюць праводзіць вадкую падкормку кустоў чорнай парэчкі чатыры разы на год — адпаведна вегетацыйным перыядам расліны:

- першы раз — калі распускаюцца пупышкі, пачынаецца рост і цвіценне;
- другую падкормку праводзяць адразу пасля цвіцення. У гэты час ідзе ўзмоцнены рост, і расліну «трэба падтрымаць». Ад гэтага залежыць велічыня прыросту, а такім чынам, і велічыня ўраджаю;
- трэцюю падкормку добра правесці ў перыяд наліву ягад (чэрвень — пачатак ліпеня). У гэты час узмацняецца патрэба пладаноснага куста ў фосфары і калії. Для падкормкі падыдуць любыя комплексныя ўгнаенні;
- пасля збору ўраджаю, перад закладкай кветкавых пупышак (канец ліпеня — жнівень) вельмі важна правесці яшчэ адну падкормку — гэта будзе закладам паспяховага пладанашэння ў наступным годзе. Але ў гэты перыяд азотныя ўгнаенні рэкамендуюць выключыць (яны затрымліваюць выспяванне парасткаў).

У залежнасці ад саставу глебы на вашым участку частата ўжывання і колькасць угнаенняў будуць, вядома, адрозніваацца. Чым бяднейшая глеба — тым больш патрабуецца яе ўзбагачаць.

Для вадкіх арганічных падкормак ужываюць настой птушынага памёту (у канцэнтрацыі 1:10), гнаявой жыжкі або каравяку (1:4). Вельмі добра, калі ў вас ёсць магчымасць зрабіць настой з зялёных пустазельных траў (зялёнае ўгнаенне) — яго канцэнтрацыя для падкормкі 1:10.

Для вадкіх мінеральных падкормак у 10 літрах вады растваpаюць 20 г фосфарных і па 10 г калійных і азотных угнаенняў.

Нормы вадкіх падкормак — прыкладна па 10 літраў пад куст.

Спецыялісты рэкамендуюць у чэрвені-ліпені праводзіць і пазакаранёвыя падкормкі парэчак мікраэлементамі. Для гэтага 5 г марганцоўкі, 3 г борнай кіслаты і 30-40 г меднага купарвасу разводзяць асобна ў рознай тары, а потым змешваюць у 10 літрах вады. Гэтым растворам апырскваюць кусты парэчак.

### КАЛІ НЕ ХАПАЕ ЧАСУ

Існуе, як заўсёды, і альтэрнатыўны спосаб забеспячэння парэчак пажыўнымі рэчывамі. Дастаткова вясной пасеяць у міжраддзях лубін, гарох, віку (сідэральныя культуры), а восенню проста перакапаць зямлю разам са скошанай зелянінай вакол кустоў.

Можна таксама проста замульчыраваць глебу пад кустоўем парэчак гноем з разліку 10-12 кг на куст (можна рабіць гэта і іншай арганікай) — і ўвогуле не ўносіць мінеральных угнаенняў. А вось ад вадкіх зялёных падкормак адмаўляцца не варта. Вельмі добра дадаваць у зялёную масу рэшткі хлеба.

## Правілы прымянення птушынага памёту

Варта памятаць, што птушыны памёт — вельмі канцэнтраванае ўгнаенне, завышаць дозы яго прымянення нельга. Пры перакопцы глебы на 1 кв. м уносяць 500 г сухога птушынага памёту. Пры пасадцы раслін яго ўносяць у лункі не больш за 8-10 г пад адну расліну.

ЭФЕКТНЫЯ ВАДКІЯ ПАДКОРМКІ. Птушыны памёт разводзяць вадой у такіх суадносінах: калі птушыны памёт свежы — то 1 кг на 10 л вады, а калі сухі — то 1 кг на 20 л воды.

Як толькі птушыны памёт набракне, яго добра размешваюць і ўносяць пад расліны, не пакідаючы на закісанне. Раствор птушынага памёту расходуюць па 2 л на 1 кв. м. Пасля таго, як палілі гэтым растворам глебу каля расліны, варта засыпаць яе пластом сухой глебы ў 1 см і паліць чыстай вадой.

# САКРЭТЫ ЧАРАНКОЎ

**Укараненне чаранкоў пакаёвых і садовых раслін у вадзе — справа нескладаная, але і тут, як і ў любой справе, ёсць свае хітрасці.**

**СВЯТЛО.** Калі на чаранку няма лісця, то ён хутчэй дасць карэньчыкі ў поўнай цемры, але калі на ім маецца хоць крыху зеляніны, то для ўкаранення яму абавязкова неабходна асвятленне.

**ПАСУДЗІНА.** У непразрыстай ёмістасці чаранкі даюць карэньчыкі значна хутчэй, чым у празрыстай.

**ВАДА.** Калі вады ў ёмістасці для ўкаранення занадта шмат, то ў выніку газаабмену на самым дне слоіка застанецца мала кіслароду і чаранок рызыкуе проста загніць, так і не даўшы каранёў. Дадатковая аэрацыя вады ў слоіку спрыяе лепшаму ўкараненню чаранкоў.

Ваду ў ёмістасці з чаранкамі лепш не мяняць, а частку, якая выпарылася, проста даліваць па меры неабходнасці. Рэзкая змена саставу вады можа выклікаць моцны стрэс у чаранкоў.

Пазбегнуць загнівання вады дапаможа пакладзеная на дно ёмістасці таблетка актываванага вугалю.

**КОЛЬКАСЦЬ ЧАРАНКОЎ.** Як ні дзіўна, але і гэты фактар можа значна паўплываць на поспех чаранкавання. Не ўсе расліны любяць «цеснату» і нават вылучаюць адмысловыя рэчывы ў ваду, каб блакіраваць рост сваіх суседзяў. Так, напрыклад, чаранкі бружмелю не дадуць карані ў агульным слоіку, калі на кожны з іх будзе прыходзіцца менш за 150 мл вады.

**ПАДКОРМКІ.** Каб павысіць выжывальнасць і ўмацаваць маладыя расліны, перад высадкай чаранкоў у грунт (за 36—48 гадзін) у ёмістасць з вадой можна дадаць біястымулятары росту.



■ Ну і ну!

## НЕЖАНОЧАЯ «ЗАБАВА» — ВЕЛАСІПЕД КРАСЦІ

**У сталіцы за крадзеж веласіпеда затрыманы дзве маладыя жанчыны, 30 і 35 гадоў.**

— Бліжэй да вечара яны праходзілі каля аднаго з будынкаў па праспекце Незалежнасці. Убачыўшы на паркоўцы ля ўваходу веласіпед «Фуджы» чорнага колеру, падышлі бліжэй. Потым дасталі з сумкі спецыяльны інструмент і перакусілі замок. Адна са зламысніц села на скрадзеную двухколавую машыну і з'ехала, а другая пайшла ў іншы бок, — паведаміла **прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга КУЦЬКО**. — Прапажу свайго веласіпеда гаспадар выявіў у канцы працоўнага дня, пасля чаго звярнуўся ў міліцыю.

Зламысніцы былі затрыманы праваахоўнікамі па месцы жыхарства. Яны нідзе не працуюць, раней былі судзімыя за незаконнае абарачэнне наркатычных сродкаў і крадзеж. Як высветлілася, скрадзены веласіпед жанчыны прадалі незнаёмаму маладому чалавеку за 80 долараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 4 МАЯ

**1772** год — нарадзіўся Фрыдрых Бракгаўз, нямецкі кнігавыдавец, заснавальнік фірмы «Бракгаўз». У 1795 годзе ў Дортмундзе Бракгаўз адкрыў аптовы гандаль англійскімі таварамі, у 1802-м перавёў яго ў Амстэрдам. У 1804 годзе англійскія тавары перасталі пастуnаць у кантынентальную Еўропу, і справа Бракгаўза развалілася. Тады ў 1805 годзе ў Амстэрдаме ён заснаваў фірму па гандлі і выданні нямецкіх кніг, і з яе пасля ўзнікла фірма «Ф.А. Бракгаўз». Нам імя Бракгаўза вядома галоўным чынам па энцыклапедычным слоўніку Бракгаўза і Эфрона, які выдаваўся ў Расіі з 1890 года. Памёр Фрыдрых Арнольд Бракгаўз 20 жніўня 1823 года ў Лейпцыгу. Яго справу працягнулі яго сыны — Генрых і Фрыдрых. Гэтая фірма існуе і цяпер.



**1799** год — нарадзіўся (мястэчка Мір) Фларыян Бохвіц, беларускі філосаф, прадстаўнік хрысціянскага напрамку філасофскай думкі. Вучыўся ў Нясвіжы, вывучаў права ва ўніверсітэтах Кіева і Вільні. Быў членам Навагрудскай карпарацыі адвакатаў. З 1818 года жыў у Навагрудскім павеце, займаўся сельскай гаспадаркай і навукова-літаратурнай дзейнасцю. Імкнуўся прымірыць рэлігійныя ідэі з навукай. Аўтар работ «Думкі аб выхаванні чалавека», «Сутнасць маёй думкі» і інш. Бохвіц не стварыў стройнай філасофскай сістэмы, але распрацаваў шэраг асобных пытанняў грамадска-палітычнага і этычнага характару. Падкрэсліваў ролю працы для нармальнага функцыянавання грамадства. Разглядаў пытанні выхавання і адукацыі ў залежнасці ад розных узростаў, закранаў праблемы жаночага выхавання (лічыў, што яно павінна быць хатнім). Выступаў за спалучэнне навучання з працоўнай дзейнасцю вучняў, гарманічнае развіццё іх разумовых і фізічных здольнасцяў. Сэнс адукацыі бачыў у выхаванні людзей, карысных для грамадства «на розных пасадах і ў розных жыццёвых абставінах». Памёр у 1856 годзе.

**1911** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (вёска Азярышча, цяпер — у Пухавіцкім раёне) Пятро Рунец, беларускі пісьменнік. У 1940 годзе скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску. Працаваў у газеце «Піянер Беларусі», часопісе «Бярозка», на Беларускім радыё. Большасць яго твораў прысвечаны юным чытачам. Сярод іх: «У вясновыя дні», «Канец казкі», «Гіпсавая маска». Разам з Янкам Маўрам склаў зборнік дзіцячых успамінаў пра вайну «Ніколі не забудзем». Памёр у 1997 годзе.

Было сказана

**Янка БРЫЛЬ,**
**народны пісьменнік Беларусі:**

*«У кожнага з нас свая мелодыя стылю. Чаму ж ты хіліш, каб я абавязкова спяваў, як ты?»*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.27 | 20.47 | 15.20 |
| Віцебск | — 5.12 | 20.41 | 15.29 |
| Магілёў | — 5.17 | 20.37 | 15.20 |
| Гомель | — 5.19 | 20.28 | 15.09 |
| Гродна | — 5.43 | 21.01 | 15.18 |
| Брэст | — 5.49 | 20.56 | 15.07 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 30.04 — 05.05. Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксея, Дзяніса, Кандрата, Мікалая, Фёдара.*
***К.*** *Антаніны, Міхала, Роберта, Рыгора.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА





## УСМІХНЕМСЯ

**Муж і жонка ў ложку. Ён пачынае рукой гладзіць яе плечы, затым бакі, яна пачынае млява ўздыхаць. Муж апускае руку ніжэй, праходзіць лінію сцягна і... прымае руку. Жонка:**

**— Мілы! Чаму ты спыніўся?**

**— Ды нарэшце знайшоў пульт ад тэлевізара!**

У любой незразумелай сітуацыі з жанчынай падлівай ёй віна.

**Вовачка дурэе на ўроку. Настаўніца:**

**— Заўтра прыводзь бацьку ў школу!**

**— Ага, зараз: я ўжо адной такой прывёў — трэці год забраць не магу...**





Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1730.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 мая 2016 года.